| | 19 | В. | пр. Іоиля м. Уара. | W. | Piotra z Alk. | В. | Іоіла пр. |
| | 20 | С. | вм. Артемія. — | S. | Ireny, Marty. | С. | Артемія вмуч. |
| ♔ | 21 | Ч. | **Возш. на Пр. Гос. Импер.** п Иларіона. м. Зот. | Cz. | ♔ Urszuli P. | Ч. | Іларіона. |
| ☩ | 22 | П. | **Казанск. ик. Б.М.** | P. | † Korduli i Al. | П. | Глікеры. |
| † | 23 | С. | **Ап. Іакова.** п. Игн. | S | Seweryna. | С. | † Якова брата Гос |
| | 24 | В. | Нед. 20. м. Ареөы. | N. | Ew. Łuk. 8,5—15<br>N. *20 po Sx.* | В. | Нед. 20 по С. Д. Ареты Анатазія |
| | 25 | П. | м: Маркіана Анаст. | P. | Kryspina i Kr. | П. | Маркіяна. |
| † | 26 | В. | вм. Димитрія селун. | W. | Ewerysta P. | В. | **Димітрыя В. М.** |
| | 27 | С. | мц. Капетолины | S. | Sabiny P. | С. | Нестора муч. |
| | 28 | Ч. | вмц. Параскевы. — | Cz. | *Szymona i Tad.* | Ч. | † Параскевіі. |
| | 29 | П. | пмц. Анастасіи | P. | † Narcyzy B. | П. | Анастазіі. |
| | 30 | С. | см. Зиновія.мц.Зин. | S. | †† Germana. | С. | Зіновія і Зіновіі. |
| | 31 | В. | Нед. 21. ап.Стафія | N. | Ew. Jana 17,1—13<br>N. *21 po Św.* | В. | Нед. 21 по СД Стахія |

**Сьвяты і прысьвяткі.** 1. Пакроу. 26 Зьмітры. **Дзяды:** I у чэцьверъ посьле Зьмітры, (28) II. у суботу (30), III у нядзелю (31).

**Прыказкі.** Пакроу зямлю пакрыу, — зямлю лістом, ваду лядом. Да Зьмітры дзеука хітра Весна не мясна, а восень не малочна.

**Swiaty i pryświatki.** 1 Pakrou. 26 Žmitry. **Dziady** I ŭ čećwier pośle Zmitry (29). II ŭ subotu (30), III ŭ niadzielu (31).

**Prykazki.** Pakrou ziamlu pakryŭ, — ziamlu listom, wadu ladom. Da Zmitra dzieŭka chitra. Wiesna nie miasna, a wosień nie małočna.

# Ноябръ ЛІСТОПАД (мае дзён 30) LISTOPAD (maje (dzion 30) Listopad

| | | | Календар праваслаўны. | | Kalendar R. Katalicki | | Календар Грэко-Уніяцкі. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| † | 1 | П. | св: **Космы, Дам.** | P | **Wsz. Sw.** | П | св.Космы і Даміяна |
| | 2 | В. | м:Акиндина, Пигас. | W | *Dzień Zaduszny.* | В | Акіндіна |
| † | 3 | С. | м:Акепсима, Агапія | S | Huberta B. W. | С | Айталя, Іосіфа. |
| | 4 | Ч. | п. Іоанникія, — | Cz | Karola Borom. | Ч | Іоанікія |
| | 5 | П. | Ап: Патрова, Ерма. | P | † Zachar. i Elż. | П | Галяктіона муч. |
| | 6 | С. | мц. Матроны, Текус. | S | Leonarda W. | С | Павла еп., Клавдіі |
| | 7 | В | Нед. 22-я. м:Ірона. Никандра, Валерія | N | Ew. Łuk.16,19—31 *N. 22 po* Sw *Opieki* | В. | Нед. 22 по Семідес. Ероніма Лазаря. |
| ✠ | 8 | П. | **Архистр. Михаила** | P | Gotfryda i M. | П | **Михаіла Архістр** |
| | 9 | В. | м: Онисифора | W | Teodora i Or. | В. | Онісіфора |
| | 10 | С. | Ап: Род. Ераста — | S | Andrzeja z Aw. | С | Ераста, Ореста |
| | 11 | Ч | вм. Мины. м. Викт. | Cz | Marcina B. W. | Ч | Міны, Віктора. |
| | 12 | П. | свт Іоанна п Нила | P | † Marcina P. | П | † Іосафата сщм. |
| — | 13 | С. | **свт. Іоанна Злат.** | S | Dydaka W. | С | † Івана Златоуст. |
| ✠ | 14 | В | *Нед.* 23-я.— **Ап. Филиппа.** | N | Ew. Łuk. 8,26—39 *N.23po* Sw ♔ Stan | В. | Нед. 23 по С.Д. Філпіа ап. |
| | 15 | П. | м:Гур, Самона Авива | P. | Leopolda W. | П. | Гурыя Самона |
| † | 16 | В. | Ап. и Ев. **Матѳея.** | W. | Edmunda B. | В. | † Матея еванг. |
| | 17 | С. | свт. Григорія | S. | Grzegorz. cud. | С. | Грыгорыя новок. |
| | 18 | Ч. | м: Платона, Закх.— | Cz. | Udona P. | Ч. | Платона |
| | 19 | П. | п:Варл, Іоасифа | P. | † Elżbiety Kr. | П. | Авдія, Варлаама |
| | 20 | С. | м Ѳеспесія см Сав. | S. | Feliksa Wal. | С. | Грыгорыя, Анат. |
| ✠ | 21 | В. | Нед. 24 **ВВЕДЕНІЕ ВО ХР. ПР.Б-ЦЫ** | N. | Ew. Łuk.10,25—27 *N. 24 po* Sw. *Ofiar.* | В. | Нед. 24 по С.Д. **Введене Пр. Д. Б.** |
| | 22 | П. | Ап. Филимона, Ар- | P. | Cecylii P. M: | П. | Філімона, Кікіліі. |
| ✠ | 23 | В. | вел.кн **Александра** Невск.свт.Амфилох | W. | Klemensa P. | В. | Грыгорыя еп. |
| | 24 | С. | вмц. Екатерины | S. | Jana od Krzyż. | С. | Катерыны вмуч. |
| † | 25 | Ч | свм:Климен, Петра | Cz. | Katarzyny D. | Ч. | Клімента |
| | 26 | П. | вмч. Георгія. — | P. | † Piotra B. | П. | Якова, Аліпія |
| | 27 | С. | **ик. БМ. Знаменіе.** | S. | Wirgiliusza. | С. | Якова перв, Ром. |
| | 28 | В. | Н. 25. м. Иринарха | N. | Ew. Łuk.13,10—17 *N.1Adw.* Mansweta | В. | Нед. 25 по С.Д. Стефана Ірін. |
| | 29 | П. | м.Парамона п.Акак. | P. | Saturnina M. | П. | Парамона, Фыл. |
| † | 30 | В. | Ап.**Ардрея**первозв. | W. | *Andrzeja Ap.* | В. | † Андрея ап. |

**Сьвяты і прысьвяткі.** 1. Кузьмы і Дземяна.— Усіх сьвятых. 2 Задушны дзень у католікоу 21. Трэцяя Прачыстая. 30 Андрея (дзявочае сьвята).

**Прыказкі.** Пакуль на гумне цэп, патуль на стале хлеб. Юры (26) Мосьциць, а Мікола гвоздзіць

**Swiaty i pryświatki.** 1 Kuźmy Dziemiana.—Usich światych. 2 Zadušny dzień u katolikoŭ. 21 Trećiaja Pračystaja. 30 Andreja (dziawočaje światа).

**Prykazki.** Pakul na humnie cep, patul na stale chleb. Jury (26) moscić, a Mikoła hwozdzić.

Инв. 1958 г. 6172

# Декабръ — СЬНЕЖЕНЬ (мае дзён 31) / SNIEŽEŃ (maje dzion 31) — Grudzień

| | | | Календар праваслаўны. | | Kalendar R.Katalicki | | Календар Грэко-Уніяцкі. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | С. | пр.Наума п.Филар. | S. | †† Eligiusza B.W. | С. | Наума. |
| | 2 | Ч. | пр Аввакума. | Cz. | Mibianny P. M. | Ч. | Авакума. |
| | 3 | П. | пр.Софоніи.п Сав— | P. | †† Franciszka K. | Р. | Софронія. |
| | 4 | С. | вмц. Варвары. | S. | Barbary P. M. | С. | † Варвары, Івана. |
| † | 5 | В. | *Нед*. 26-я.-п:**Саввы**<br>Захаріи. свт Гурія | N. | Ew. Luk. 13,20—17<br>*2 Adw*. Sabby Op. | В. | Нед 26 по С Д.<br>Савы преп. |
| ♔ | 6 | П. | **Тезоим. Госуд. Импер.<br>свт. Николая.** | P. | ♔ Mikołaja B.W. | П. | **Ніколая Чудотв.** |
| | 7 | В. | свт.Амвросія.п Нил. | W. | †† *Wig*. Amb. M. | В. | Амброзія |
| | 8 | С. | п.Поатапія. ап.Киф | S. | **†† Niep. Pocz.NMP.** | С. | Патапія Предп. З. |
| † | 9 | Ч. | Зачатіесв.Анною Б. | Cz. | Waleryi iLeokadyi | Ч. | **Зачате Пр. Д. М.** |
| | 10 | П. | м:Евграфа, Мины— | P. | †† NMP. *Loretań*. | П. | Міны Ерм. |
| | 11 | С. | п: Даніила, Луки. | S. | Damazego P. M. | С. | Данііла столп. |
| † | **12** | В. | Нед. Св.Праотецъ.<br>свт. Спиридона. | N. | Ew. Łuk. 6,17—23<br>*2 Adw*. Aleksandra | В. | Нед 27 по С. Д.<br>Спірідона пр. |
| | 13 | П. | м:Евстратія,Евгенія | P. | Łucyi P. M. | П. | Евгенія Ореста. |
| | 14 | В. | м: Θирса, Левкія. | W. | Dyoskora i Herona | В. | Філімона. |
| | 15 | С. | см.Елевθерія мц Ан. | S. | †† *Suchy dz*. Wal. | С. | Елевтерія свмч. |
| | 16 | Ч. | пр. Аггея. бл. Θеоф. | Cz. | Euzebiusza. | Ч. | Аггея |
| | 17 | П. | пр Даніила. | P. | †† *Suchy dz*. Łaz. | П. | Даніла прор. |
| | 18 | С. | п. Модеста еп. | S. | †† *Suchy dz Ocz*. | С. | Севастіяна. |
| † | 19 | В. | *Нед*.перед.Рождест.<br>м: Вонифатія, Иліи | N. | Ew. Łuk. 2,1—20<br>*4 Adw*. Teofil i Z. | В. | Нед. **Праотец.**<br>Боніфація м. |
| | 20 | П | свм. Игнатія Богон. | P. | Tomasza Apost. | П | Ігнатія Богонос. |
| | 21 | В. | свт. **Петра** митр. | W | Herona M., Zenona | В. | Юльяны муч. |
| | 22 | С. | вмц. Анастасіи м:<br>Хрисогона, Евода | S. | Wiktoryi P. | С. | Анастазіі муч. |
| | 23 | Ч. | м: Помпія, Евареста | Cz. | †† *Wigilia*. Irmin. | Ч. | Давіда пр.і Якуба а. |
| | 24 | П. | пмц. Евгеніи. м. Пр. | P. | **Szczepana 1 Męcz.** | П. | Евгеніі муч. |
| ✠ | 25 | С. | **РОЖДЕСТ. І. ХР.** | S. | **Narodz. Chrys. P.** | С. | **Рожество Господ.** |
| ✠ | 26 | В. | Нед. по Рождеств.<br>**Соб. Пр. Б-цы. —** | N. | Ew. Mat. 2,13—23.<br>**N. po N. Chr.** *Jana* | В. | Нед. по Рожд.<br>**Собор. Пр. Б-цы** |
| ✠ | 27 | П | Ап. и првм. Стеф. | P. | Młodzianków M.m. | П. | Степана муч. |
| † | 28 | В. | м: Гликерія, Горгон | W. | Tomasza Kantu r. | В. | 20,000 туч. |
| | 29 | С. | 14 т. млад. п Θадд. | S. | Eugeninsza B. W. | С. | **Младенцовъ.** |
| | 30 | Ч. | м:Анисіи, Филетера | Cz. | Sylwestra P. W. | П. | Анезіі муч. |
| | 31 | П. | п. Меланіи римлян | P. | | Ч. | Меланіі рымлян. |

**Сьвяты і прысьвяткі:** 4. Варвары. 6 Мікалая 24. Калядная куцьця 25 Каляды. 31 Шчодрая або богатая куцьця.

**Прыказкі:** Св. Мікола маrозам гвоздзіць. Варвара ночы урвала. Мікола правая зіма і правое лета. Калядкі гаспадарскіе парадкі

**Swiaty i pryświatki**. 4 Barbary. 6 Mikałaja. 24 Kaladnaja kućcia. 25 Kalady. 31 Ščodraja abo bahataja kućcia.

**Prykazki**. Sw. Mikoła marozam hwozdzić. Barbara noču urwała. Mikoła prawaje leto. Kaladki haspadarskije paradki.

# Жыдоускі календар.

| | |
|---|---|
| Студзень | 12 Хамішо Оссор 27 Маладзік 1 дзень. |
| Люты | 1 Маладзік 2 дзень. 10 Пурым Котон. 11 Шушан Пурым Котон. 26—27 Маладзік. |
| Сакавік | 11 Пост Естэры. 12 Пурым Аман. 13 Шушан пурым 28 Маладзік. |
| Красавік | 11—12 Першые дні (Велікодня) Пэйсах. 13—16 Хол-гамеод. 17—18 Апошніе дні Пэйсах 26—27 Маладзік. |
| Травень | 14 Лаг Бэоймэр 26 Мададзік, 31 Швуойс, першы дзень. |
| Червень | 1 Швуойс другі дзень. 24—25 Маладзік. |
| Ліпень | 11 Пост Руіны Ерузаліма 24 Маладзік. |
| Серпень | 1 Пост Спаленьня Храма Ерус. 22—23 Малад. |
| Вересень | 21—22 Новы Год 5671. 23 Гедаляго (пост) 30 Ачышчэне Пом. Кіпур. (страшная ноч). |
| Кастрычнік | 5—6 Першые дні Кучэк (сукойс). 7—10 Хол Гамеод 11 Гошано рабо. 12 Шміні Ацерес 13 Сімхос Тойро. 20—21 Маладзік. |
| Лістапад | 19 Маладзік. |
| Сьнежэнь | 13—20 Ханука (Абнаўленьне) 18—19 Маладзік, 28 Пост Асада Іерузаліма. |

# Перэмены месяца.

## Студзень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 5 чысл. | 12 ч. 51 м. | дня. |
| ○ | 12 „ | 2 ч. 21 м. | дня |
| ☾ | 20 „ | 1 ч. 57 м. | дня. |
| ● | 28 „ | 3 ч. 43 м. | ноч. |

## Люты.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 3 чысл. | 9 ч. 03 м. | веч. |
| ○ | 11 „ | 6 ч. 06 м. | ран. |
| ☾ | 19 „ | 10 ч. 22 м. | ран |
| ● | 26 „ | 2 ч. 43 м. | дня |

## Сакавік.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 5 чысл. | 6 ч. 8 м. | ран. |
| ○ | 12 „ | 12 ч. 51 м. | веч. |
| ☾ | 21 „ | 3 ч. 18 м. | ноч. |
| ● | 27 „ | 11 ч. 55 м. | веч. |

## Красавік.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 3 чысл. | 4 ч. 34 м. | дня. |
| ○ | 11 „ | 3 ч. 53 м. | дня. |
| ☾ | 19 „ | 4 ч. — м. | дня. |
| ● | 26 „ | 8 ч. 53 м. | ран. |

## Травень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 3 чысл. | 4 ч. 43 м. | ноч. |
| ○ | 11 „ | 8 ч. 09 м. | веч. |
| ☾ | 19 „ | 12 ч. 55 м. | дня. |
| ● | 25 „ | 3 ч. 47 м. | дня. |

## Чэрвень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 1 чысл. | 6 ч. 50 м. | веч. |
| ○ | 9 „ | 10 ч. 42 м. | всч. |
| ☾ | 17 „ | 7 ч. 09 м. | ран. |
| ● | 23 „ | 11 ч. 50 м. | веч. |

## Ліпень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 1 чысл. | 10 ч. 55 м. | рані |
| ○ | 9 „ | 11 ч. 07 м. | рані |
| ☾ | 16 „ | 12 ч. 05 м. | дня. |
| ● | 23 „ | 9 ч. 07 м. | рані |
| ☽ | 31 „ | 4 ч. 31 м. | ноч. |

## Серпень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 7 чысл. | 9 ч. 44 м. | веч. |
| ○ | 14 „ | 5 ч. 04 м. | веч. |
| ☾ | 21 „ | 8 ч. 36 м. | веч. |
| ● | 29 „ | 10 ч. 41 м. | веч. |

### Вересень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 6 чысл. | 7 ч. 23 м. | раніц. |
| ○ | 12 „ | 11 ч. 24 м. | веч. |
| ☾ | 20 „ | 11 ч. 02 м. | дня |
| ● | 28 „ | 4 ч. 10 м. | дня. |

### Кастрычнік.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 5 чысл. | 4 ч. 55 м. | дня. |
| ○ | 12 „ | 8 ч. 18 м. | раніц. |
| ☾ | 20 „ | 4 ч. 26 м. | ноч. |
| ● | 28 „ | 8 ч. — | раніц. |

### Лістапад.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 4 чысл. | 2 ч. 55 м. | ноч. |
| ○ | 10 „ | 8 ч. 44 м. | веч. |
| ☾ | 18 „ | 11 ч. 41 м. | веч. |
| ● | 26 „ | 9 ч. 36 м. | веч. |

### Сьнежень.

| | | | |
|---|---|---|---|
| ☽ | 3 чысл. | 1 ч. 35 м. | дня. |
| ○ | 10 „ | 1 ч. 06 м. | дня. |
| ☾ | 18 „ | 6 ч. 52 м. | веч. |
| ● | 26 „ | 8 ч. 51 м. | раніц. |

## Пагода па календару Бруса на 1910 год.

**Студзень.** 1 ядрэно і сьнежно, 5 вецер, 7 дождж, 15 вецер, 20 і 26 сьнежно і марозно.

**Люты.** 1 вецер, 3 туманна, 6 золь, 12 сьцюдёна і ясна, 19 і 20 мокра, 23 сьнег, 26 ясно, 28 непагодзь.

**Сакавік.** 1 золь, 4 мокра і ветрэна, 5 сільны дождж, 7, 8, 10 і 11 сьцюдзёна, 15 слата, 19 і 20 хмурна і ветрэна, 22 і 25 сьнег, дождж, золь, 28 вецер.

**Красавік.** 1 ясна, 7 мокра, 13 хмурна і пераменна, 18 склонна к дожджу, 20 холад, вецер і слата, 24 ясна і пад канец месяца дажджы.

**Травень** 1 ясна, 5 і 6 сьпека, 8 вецер, 10 пераменна, 17 сільны дождж і пахмурная пагода да канца месяца.

**Чэрвень.** 1 цёпла, 5 ясна, 9 пераменна, 12 добрая пагода, 18 непагодзь, 27 цёпла і да канца добрая пагода.

**Ліпень.** 1 сонечна, 7 сьпека, 24 дождж, 27 пахмурна і да канца пераменная пагода.

**Серпень.** 1 добрая пагода, 8 і 12 дождж і грымоты, 16 дождж, 23 ясна і сьцюдзёна, з 27 і да канца халады дажджы начамі.

**Верэсень.** 1 віхор, холад, дождж, 7 і 8 пераменная пагода, 14 срэдняя, 24, 25 і 26 золь, град, 28 халодны паўночны вецер, 29 і 30 дождж або сьнег.

**Кастрычнік.** 1 холад, 6 і 7 дождж і вецер, 14 кепская пагода, 17 і 18 дождж або сьнег, 21 пераменна, 22, 23, 26 і 30 вялікі дождж, непагодзь, пахмурна.

**Лістапад.** 1 халодна і пахмурна, 3 і 4 холад і золь, 6 і 7 холад і дождж, 9 мароз, а пасьля цёпла, 20 мароз, 27 пераменна.

**Сьнежань.** 1 пераменна, 13 халодна, 16 дождж, пахмурна, 19 і 20 вялікі вецер, 23 вецер, пасьля пераменна.

# Важнейшые кірмашы на Беларусі.

## *Мінская губэрня.*

**Берэзіна**—6—9 серпня. **Бабруйск**—1 студня, 9-аго траўня і 1 кастрычніка. **Барысоў**—1 студня і ў 10-ю серэду пасьля Вялікадня. **Божнігородзк**—1 верэсьня. **Койданоў**—1 лютаго, 23 красавіка, 8 і 18 траўня, 20-го ліпня і 1 кастрычніка. **Логічын**—1 чэрвеня, 6 серпня і 1 кастрычніка. **Лоеў**—на 10 тыдзень пасьля Вялікадня. **Любашеў**—2 траўня, 8 верэсьня і 6 сьнежня. **Мінск**—25 траўня і 22 чэрвеня. **Мір**—3—9 траўня, ў 4 панядзелкі, а так сама і 3—6 сьнежня. **Мазыр**—6 і 27 студня і 6 і 28 серпня. **Несьвіж**—13—17 верэсьня. **Новагрудак**—19 сакавіка. **Парычы**—14 кастрычніка. **Петрыкоў**—20 чэрвеня і 1 кастрычніка. **Пінск**—у дзень Тройцы, на 10 нядзелі па Вялікадні і 11—16 чэрвеня. **Пуховічы**—у траўня і 6 сьнежня. **Рэчыца**—у, 23 траўня і 6, 25 сьнежня. **Сьвержэнь**—29 чэрвеня. **Хойнікі**—2 лютаго і 1 кастрычніка.

## *Віленская губэрня.*

**Боруны**—29 чэрвеня і 1 кастрычніка. **Бутрыманцы**—1 студня і 18 чэрвеня. **Вільня**—з 23 красавіка да 15 траўня і на сьв. Казіміра. **Ворняны**—6—7 студня, 2 і 5 дзень Вялікадня. **Высокі Двор**—28 траўня і 1 кастрычніка. **Вішнев**—1 студня, 9 траўня, 15 серпня, 15 верэсьня і 28 кастрчыніка. **Даугіноў**—20—21 траўня. **Друя**—6—10 студня і на першым тыдні Вялікаго Посту 3 дні. **Дуніловічы**—1 студня і кастрычніка. **Жосьлі**—6 лютаго, 3 красавіка, 16 чэрвеня і 1 лістапада. **Жупраны**—9 чэрвеня, 25 ліпня і 1 лістапада. **Жадзево**—6 серпня. **Крэво**—9 траўня і кастрычніка. **Лужкі**—24 студня і 8 верэсьня. **Мерлі**—1 кастрычніка. **Мядзель**—на Вербны Тыдзень, 4—12 чэрвеня, 20 серпня і 30 кастрычніка. **Мусьнікі**—на Сёмку. **Оліта**—4 сакавіка і 1 лістапада. **Ошмяны**—23 красавіка і 29 верэсьня. **Радашковічы**—6—9 траўня. **Свенцяны**—1—6 студня і 1—7 верэсьня. **Смаргонь**—15—18 студня, ў палавіне Вялікаго Посту, 11—13 траўня, з 20 серпня да 1 верэсьня і 8—29 верэсьня. **Стоклішкі**—3 красавіка. **Шчучын**—15 чэрвеня і с 15 кастрычніка праз месяц. **Эйшышкі**—18 траўня і на Шосьнік.

## *Вітэбская губэрня.*

**Бешэнковічы**—29 чэрвеня. **Веліж** — у другі тыдзень Вялікаго Посту і з 20 чэрвеня праз два тыдні. **Дзьвінск**—з 25 сьнежня да 7 студня і з 3 да 20 чэрвеня. **Нэвэль**—з 6 студня і з 20 чэрвеня на 2 тыдні. **Освей**—28 чэрвеня і 9 траўня. **Полоцк**—15 траўня на Баболега. **Рэжыца**—з 2 чэрвеня і 8 верэсьня на 2 тыдні. **Себеж**—у 1 тыдзень Вялікаго Посту, 25 сакавіка, 23 красавіка, 1 серпня і 6 лістапада.

## *Магілёуская губэрня.*

**Быхоў**—у 1 тыдзен Вялікаго Посту, на Дзесятніка і апошні тыдзень Піліпоўкі. **Гомель**—1 студня, на Тройцу і 14 верэсьня. **Ляды**—с Тройцы праз 7 дзён, 20 ліпня і 1 кастрычніка. **Любавічы**—з 1 студня да 6 лютаго. **Магілёў**—10—18 студня, з 29 чэрвеня да 2 ліпня (коньскі) і 15—24 ліпня. **Орша**—9 траўня. **Чаусы**—23 красавіка, 26 лістапада і на 1 тыдні Вялікаго Посту. **Чэрыкоў**—на 1 тыдзень Вялікаго Посту, на Тройцу, 1 кастрычніка і 10 сьнежня. **Шклоў**—на 2 тыдні Вялікаго Посту і на Дзевятнік.

## *Гродзенская губэрня.*

**Беласток**—24 чэрвеня. **Вялікая Берэстовіца**—6 траўня. **Валадоўка**—1 кастрычніка. **Высока-Літоуск**—25 чэрвеня. **Гродна**—з 27 чэрвеня да 26 ліпня. **Зэльва**—з 25 ліпня да 25 серпня. **Свіслоч**—26 серпня.

| Названьня гарадоў і мястэчак. | Якой губэрні. | Адлегласць ад губ. гор. | Лічба жыц. у тысячах. | Станцiя жалезнай дарогі. |
|---|---|---|---|---|
| Бабруйск пав. | Мінскай. | 139 | 35 | Бабруйск Л.-Р. |
| Барысоў „ | Мінскай. | 75 | 15 | Барысоў М.-Б. |
| Брэст-Літ. „ | Гродзенскай. | 203 | 46 | Брэст Літ М.-Б. |
| Бранск зашт. г. | Гродзенскай. | 12 | 4 | Бельск Ю.-З. |
| Беласток пав. | Гродзенскай. | 79 | 64 | Беласток, спв. в. |
| Бельск пав. | Гродзенскай. | 122 | 7 | Бельск Ю.-З. |
| — | — | — | — | — |
| Веліж пав. | Вітэбскай. | 79 | 12 | Вітэбск Р. О. |
| **Вільня** | губэрнск. | — | 160 | Вільня спв. в. |
| **Вітэбск** | губэрнск. | — | 66 | Вітэбск Р.-О. |
| Волковыск. пав. | Гродзенскай. | 86 | 11 | Волковыск Пол. |
| — | — | — | — | — |
| Гомель пав. | Магілёўскай. | 171 | 37 | Гомель Л.-Р. |
| Гоніондз мяст. | Гродзенскай. | 132 | 3 | Осовец Ю.-З. |
| Горкі пав. | Магілёўскай. | 81 | 7 | Краснае М.-Б. |
| Гарадок пав. | Вітэбскай. | 37 | 5 | Вітэбск Р.-О. |
| **Гродна** | губэрнск. | — | 47 | Гродна СПБ-В. |
| — | — | — | — | — |
| Дзьвінск пав. | Вітэбскай. | 244 | 72 | Дзьвінск спв.-в. |
| Дзісна пав. | Віленскай. | 296 | 7 | Борковічы Р.-О. |
| Докшыцы з. г. | Мінскай. | 182 | 4 | Парафьяново в.с |
| Дрысса пав. | Вітэбскай. | 158 | 4 | Дрысса Р.-О. |
| Дрогічын з. г. | Гродзенскай. | 168 | 2 | Бельск Ю.-З. |
| Друскенікі м. | Гродзенскай. | 38 | 1 | Парэччэ спв. В. |
| Друя зашт. г. | Віленскай. | 261 | 4 | — |
| — | — | — | — | — |
| Жлобін мяст. | Магілёўскай. | 129 | 2 | Жлобін Л.-Р. |
| — | — | — | — | — |
| Ігумен пав. | Мінскай. | 98 | 5 | Пуховічы Л.-Р. |
| — | — | — | — | — |
| Клешчэлі з. г. | Гродзенскай. | 137 | 2 | Клешчэлі Ю.-З. |
| Клімовічы пав. | Магілёўскай. | 89 | 5 | Рослаўль Р.-О. |
| Кнышын з. г. | Гродзенскай. | 99 | 3 | Кнышын Ю.-З. |
| Кобрын пав. | Гродзенскай. | 135 | 10 | Кобрын Пол. |
| Копысь з. г. | Магілёўскай. | 43 | 3 | Копысь Р. О. |
| Крэслаўка м. | Вітэбскай. | 205 | 4 | Крэслаўка Р.-О. |
| — | — | — | — | — |
| Лепэль пав. | Вітэбскай. | 113 | 6 | Ст.-Село Р. О. |
| Ліда пав. | Віленскай. | 89 | 9 | Ліда Пол. |
| Люцын пав. | Вітэбскай. | 255 | 4 | Люцын М.-В.-Р. |
| — | — | — | — | — |
| **Мінск.** | губэрнск. | — | 91 | Мінск. Л.-Р. |

| Названьня гарадоў і мястэчэк. | Якой губэрні. | Адлеглясць ад губ. гор. | Лічба жыхц. у тысячах. | Станція жалезнай дарогі. |
|---|---|---|---|---|
| **Магілёў** | Губэрнск. | — | 43 | Магілёў Р.-О. |
| **Мозыр** | Мінскай. | 306 | 11 | Мозыр Пол. |
| **Мсціслаўль** | Магілёўскай. | 139 | 8 | Орша М.-Б. |
| — | — | — | — | — |
| **Нарэў** з. г. | Гродзенскай. | 152 | 1 | Бельск Ю.-З. |
| Нэвэль пав. | Вітэбскай. | 95 | 10 | Нэвэль Бал.-С. |
| Несьвіж з. г. | Мінскай. | 105 | 8 | Замірье М.-Б. |
| Новагрудак п. | Мінскай. | 153 | 8 | Новоельня Пол. |
| — | — | — | — | — |
| **Орша** пав. | Магілёўскай. | 76 | 13 | Орша М. Б. |
| Ошмяны пав. | Віленскай. | 74 | 6 | Солы Л.-Р. |
| — | — | — | — | — |
| **Пінск** пав. | Мінскай. | 254 | 28 | Пінск. Пол. |
| Полоцк пав. | Вітэбскай. | 94 | 21 | Полоцк Р.-О. |
| Пружаны пав. | Гродзенскай. | 183 | 8 | Лінево М.-Б. |
| — | — | — | — | — |
| **Рогачоў** пав. | Магілёўскай. | 94 | 9 | Рогачоў Р.-О. |
| Рэжыца пав. | Вітэбскай. | 282 | 11 | Рэжыца СПБ-В. |
| Рэчыца пав. | Мінскай. | 178 | 9 | Рэчыца Пол. |
| — | — | — | — | — |
| **Свенцяны** пав. | Віленскай. | 84 | 6 | Свенцяны спб-в. |
| Себеж пав. | Вітэбскай. | 195 | 4 | Себеж М.-В.-Р. |
| Слонім пав. | Гродзенскай. | 167 | 16 | Слонім Пал. |
| Слуцк пав. | Мінскай. | 185 | 14 | Ст. Дарогі Л.-Р. |
| Смаргонь мяст. | Віленскай. | 76 | 7 | Смаргонь Л.-Р. |
| Соколка пав. | Гродзенскай. | 43 | 8 | Соколка спб.-в. |
| Сураж з. г. | Вітэбскай. | 39 | 3 | Вітэбск Р.-О. |
| Сухаволя з. г. | Гродзенскай. | 46 | 3 | Соколка спб.-в. |
| Сенно пав. | Магілёўскай. | 148 | 4 | Коханово М.-Б. |
| — | — | — | — | — |
| **Трокі** пав. | Віленскай. | 26 | 3 | Ландварово спб-в. |
| Тўроў мяст. | Мінскай. | 467 | 3 | Жытковічы П. |
| — | — | — | — | — |
| **Чаўсы** пав. | Магілёўскай. | 48 | 6 | Орша М.-Б. |
| Чэрыкоў пав. | Магілёўскай. | 87 | 5 | Рослаўль Р.-О. |
| Чэчэрск мяст. | Магілёўскай. | — | 12 | Гомель Пол. |
| — | — | — | — | — |
| **Шклоў** мяст. | Магілёўскай. | 52 | 10 | Шклоў Р.-О. |

# Народная асьвета у Расеі і у др. гасударствах.

**Расходы на народную асьвету ў розных гасударствах, лічучы на аднаго жыцеля ў год:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| Злучэные Штаты | 4 р. 86 к. | Данія | 1 р. 52 к. |
| Немеччына | 3 „ 43 „ | Швэція | 1 „ 33 „ |
| Швэйцарыя | 2 „ 43 „ | Норвэгія | — 97 „ |
| Англія | 2 „ 36 „ | Італія | — 76 „ |
| Голландія | 1 „ 99 „ | Японія | — 54 „ |
| Бэльгія | 1 „ 69 „ | Расея | — 31 „ |
| Францція | 1 „ 66 „ | | |

# Лічба школ і вучнёў у іх.

**На колькі жыцелёў прыходзіцца адна пачатковая школа ў розных гасударствах:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| У Норвэгіі 1 шк. на | 365 | „ Даніі „ „ „ | 728 |
| „ Швэціі „ „ „ | 441 | „ Немеччыне „ „ | 924 |
| „ Італіі „ „ „ | 520 | „ Англіі „ „ „ | 1281 |
| „ Гішпаніі „ „ „ | 595 | „ Японіі „ „ „ | 1918 |
| „ Швэйцарыі „ „ | 706 | „ Расеі „ „ „ | 2637 |

**На колькі жыцелёў прыходзіцца адна сярэдняя школа:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| У Італіі на | 21,620 | „ Немеччыне „ | 49,460 |
| „ Швэйцарыі „ | 24,477 | „ Расеі „ | 103,638 |
| „ Францціі „ | 35,566 | | |

**На колькі жыцелёў прыходзіцца адна вышэйшая школа:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| У Італіі на | 476,190 | „ Немеччыне „ | 1,376,363 |
| „ Швэйцарыі „ | 444,571 | „ Расеі „ | 10,615,905 |
| „ Францціі „ | 601,813 | | |

**На тысячу жыцелёў вучыцца ў школах:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| У Злучэных Амэрык. Штатах | 230 | „ Немеччыне | 158 |
| У Англіі | 176 | „ Францціі | 144 |
| „ Норвэгіі | 174 | „ Японіі | 76 |
| „ Швэціі | 164 | „ Расеі | 32 |
| „ Швэйцарыі | 163 | „ Турцыі | 26 |

# Граматнасць у розных краёх.

**С тысячы новабранцоў не умее чытаць:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| У Швэціі | 2 | У Францціі | 74 |
| „ Даніі | 4 | „ Японіі | 156 |
| „ Швэйцарыі | 6 | „ Расеі | 600 |
| „ Немеччыне | 6 | | |

# Асьвета за межамі школы.

**На колькі жыцелёў прыходзіцца адна бібліотэка:**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| У Швэйцарыі | 1 бібліотэка | на | 3 | тысячы | 60 | жыцелёў |
| „ Швэціі . . | „ | „ | 3 | „ | 330 | „ |
| „ Злуч. Штатах | „ | „ | 13 | „ | 207 | „ |
| „ Бэльгіі . . | „ | „ | 15 | „ | 000 | „ |
| „ Расеі . . . | „ | „ | 83 | „ | 330 | „ |

**Колькі грошэй ідзе ў Расеі на пачатковую асьвету і аткуль яны бяруцца** (1900 года).

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Ад земстваў . . . . . . | 11 | мільёноў | 484 | тыс. | 134 | руб. |
| „ гасударст. казначэйства | 10 | „ | 372 | „ | 653 | „ |
| „ сельскіх обчэств . . . | 8 | „ | 332 | „ | 927 | „ |
| „ гарадзкіх обчэств . . . | 6 | „ | 960 | „ | 173 | „ |
| „ прыватных асоб . . . | 6 | „ | 701 | „ | 467 | „ |
| С платы за навучаньне . | 3 | „ | 175 | „ | 198 | „ |
| З іншых крыніц . . . . | 3 | „ | 005 | „ | 825 | „ |
| усяго . . | 50 | мільёноў | 56 | тыс. | 182 | руб. |

Ад гасударственых расходоў Расеі у 1900 гаду на кожнаго чэлавека прыходзілося па 15 руб.
З гэтых грашэй на пачатковую асьвету ішло 7⁴/₅ кап.. а на ваенные расходы 3 руб. 40 кап.

# Войска.

**Лічба сухапутнаго войска глаўных гасударств:**

| | у мірны час | у ваенны час. |
|---|---|---|
| Аўстро-Венгрыя | 382 тысячы | 2 мільёны 330 тысяч |
| Англія . . . . . | 600 „ | — „ — „ |
| Немеччына . . . | 604 „ | 4 „ 358 „ |
| Італія . . . . . | 278 „ | 3 „ 323 „ |
| Францiя . . . . | 575 „ | 2 „ 600 „ |
| Злучэные Штаты. | 64 „ | 10 „ 000 „ |
| Японія . . . . . | 640 „ | 1 „ 388 „ |
| Расея . | 1 мільён 133 „ | 3 мільёны 700 тысяч |

**На кожную тысячу жыцелёў прыходзіцца салдат:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| У Франціі . . | 14 чэлавек | „ Аўстро-Вэнг. | 8 | „ |
| „ Японіі . . . | 13 „ | „ Італіі . . . | 8 | „ |
| „ Немеччыне . | 10 „ | „ Англіі . . . | 2 | „ |
| „ Расеі . . . . | 9 „ | „ Злуч. Штатах | 1 | „ |

**С кожнаго рубля свайго расходу на войска плаціць:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Англія . . . . | 35 | капеек | Італія . . . . | 22 | „ |
| Расея . . . . | 35 | „ | Аустро-Вэнгр. | 19 | „ |
| Францыя . . . | 29 | „ | Пруссія . . . | 18 | „ |

**Колькі вытрачывае на яду ў год:**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Жыцель Канады | 116 | руб. | Француз . . . . | 76 | „ |
| Шотландзец . . | 103 | „ | Немец . . . . . | 70 | „ |
| Англічанін . . . | 101 | „ | Сібірак . . . . | 58 | „ |
| Ірландзец . . . | 97 | „ | Кіргіз . . . . . | 43 | „ |
| Амэрыканец. . . | 77 | „ | Расеец. . . . . | 20 | „ |

**Колькі каштуе пляшка гарэлкі.**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| За выгонку . . . | $5^1/_2$ | кап. | нагрwelды служачым | $^1/_{18}$ | „ |
| „ упраўленьне . | $^1/_3$ | „ | падмога папечыцел. | $^1/_4$ | „ |
| „ краму . . . | $1^1/_2$ | „ | расходы на манапол. | $^1/_2$ | „ |
| плата зборшчыкам. | $^1/_5$ | „ | безакц. адлічываньня | $^6/_7$ | „ |
| перэвозка . . . . | $1^1/_3$ | „ | выпадковых расх. | $^1/_{28}$ | „ |

Увесь кошт 10 кап.

# Сельская гаспадарка.

## Як на торфе зрабіць сенажаць.

У газэце „Хутор“ апісано, як фінляндцы торфяные дзікіе балоты заменяюць на пекные лугі, с каторых зьбіраюць пудоў па 200—300 сена з дзесяціны. Падумаеш толькі, што у нас пры лепшых варунках і лепшай зямлі, добра лічучы, набіраецца толькі якіх 100 пудоў, а то і 60—40, дый бывае, што і таго менш сена з дзесяціны,—вось табе і стане яснай розніца меж гаспадаркай культурнай і первабытнай, якая у нас заведзена.

Торфяное балота, каторае хочуць замяніць на луг, фінляндцы перш-наперш асушаюць, капаючы праз кожные 10 сажнёў каналы (равы) 1½ аршына шырынёй і аршын з чверцей глыбінёй. Зямлю з гэтых равоў раскідываюць роўненька паверх асушэнаго балота. Наверх на торф навозяць гліны вазоў па 300 — 400 на дзесяціну, пасьля пасыпаюць вапнай — пудоў 60 — 80 на дзесяціну і засьцілаюць ешчэ гноем—пудоў па два на квадратны сажэнь; каліж нема гною, то падсыпаюць мінэральные парашкі (40 пудоў каініту і 18 пудоў томасшляку). Унавожэны луг раўнуюць, барануючы цяжкімі жалезнымі баронамі (перш кальцавой бараной і пружыннай бараной) пакуль не раздробяцца ўсе комья і луг ня зробіцца саўсім гладкі і чорны. Пасьля прыступаюць да пасеву: сеюць перш віку з аўсом, каторую плытка загорываюць і баранують, ды ешчэ на верх мешанку з зернят такіх вось траў, бяручы на дзесяціну:

| | | |
|---|---|---|
| Канюшыны чырвонай . . . | 15 | фунтоў |
| „ швэдзкай . . . | 10 | „ |
| „ белай . . . . | 2 | „ |
| Ежы (Destylis glomerata) . . | 10 | „ |
| Цімафееўкі . . . . . . . | 10 | „ |
| Рэйграс (Avena elatior). . . | 4 | „ |
| Авсяніцы (Festuca pratensi) . | 8 | „ |
| Разам | 1 пуд 18 | фунтоў. |

Насеньня траў укачываюць гладкай качалкай. У першым ўжо гаду балота дае з дзесяціны пудоў 200 віковай мешанкі, а ў другіе гады зьбіраюць па 200—300 пудоў і больш добраго сытнаго сена.

Як відзім, людзі ў Фінляндіі змагаюцца з непрыветнай натурай і змагаюць яе працай і знаньнем, каторае бяруць з рад вучоных людзей і добрых кніжок. У нас жэ пры лепшай зямлі і цеплейшым леці шмат лягчэй і меншым коштам можна тое самае зрабіць пры стараннасьці і ахвоце.

Польскі вучоны землероб Сэмполовскі вучыць, як трэба папраўляць торфяные балоты у нас. Вось, відзім мы з яго рад, што ў нашым клімаценя трэба навазіць балота глінай, не канечне сыпаць і дарагіе фабрычные гнаі (каініт і томасшляк), апроч аднэй вапны, каторая канечне на торф патрэбна, каб звясьці кісьлю ў торфе. А ўсё другое: асушку, бараньбу і пасеў і у нас трэба так сама рабіць, як робяць фінляндцы.



Кальцавая барана з 12 кругамі. Такую барану пускаюць каб парэзаць дзірван.

Пара ўжо нам пакінуць прадвечные способы гаспадаркі, а прынязца завадзіць новые—такіе, якіе заведзены у нашых культурных суседзей і якіх вымагае самое жыцьцё.

Дружне возьмемся за працу каля бацькоўскай зямелькі, а згінуць, як злая мара, ліхалецьця і мор жывёлы на прадвесьні, які скрось быў той год ад нехвату корму. **Лішні**.

# Торф у сельскай гаспадарцы.

На нізкіх мейсцох, гдзе застаіваецца вада, у нас шмат торфяніч. Яны робяцца гэтак: мох-торфянік, што там расьце, прагнівае і апушчаецца ў зямлю; на ім нарастае новы мох і так сама апушчаецца ў ніз; гэтак робіцца з году ў год, і ў зямлі залегаюць пласты прагнўшаго моху, каторы і называецца *торфом*. У ім пападаюцца і трава, асака, лісьце дзярэў. Усё гэта ляжыць сотнямі і тысячамі гадоў.—Самы ніз найбольш прагнівае і прэе, ды робіцца як-бы чорнае ці бурае цеста; гэта і ёсць той самый торф, што ідзе на апал. Але ужываюць яго і на другіе рэчы.

Гэты торф, што як цеста, здатны і да гнаеньня поля. Толькі вывазіць яго просто на поле *нельга*: трэба,

каб ён перш выветрыўся і струхлеў. На тое ў восень яго рэжуць у цэглы і складываюць на сухім мейсцы, як сажэні дроў, толькі ешчэ выжэй; палежаўшы два, тры або чатыры годы торф гэты пачынае сыпацца, як парашок, непатрэбные квасы вымываюцца вадой і вымерзаюць, і тады можна вазіць яго у *хлеу* ды падсьцілаць жывёлу. Накладаюць яго вершкі на чатыры, а зверху накідаецца салома. Як скаціна добра утопчэ і згноіць торф, то праз нядзелі дзьве можна выкідаць с хлева ў кучу, а гдзе німа моды выкідаць гной с хлявоў, там насьцілаюць новы пласт торфянога парашку і саломы. Пазьней ім і гнояць поле.—Лепшы торф на поле гэта з сітніка і асакі.

Каб гнаіць поле тым торфам, што як цеста і што ідзе на апал, можна і абмінуць хлеў, і тады трэба на двары рабіць *компостные* ямы ці кучы. Яму капаюць аршыны на два глыбіні і шырыні, а даўжыні—як выгадней. Добра гэту яму выкапаць пры самым спадзе с хлевоў, каб туды сьцекала гнаёўка. На дно кладзецца грубы пласт торфу. У яму сыпецца ўселякае сьмецьцё, попел, сажа,—выліваюцца памыі. Ад часу да часу перэкідываюць усё гэта і дакладываюць новаго торфу. Як усё скрось стане роўна чорна—як чорназём, гэты гной вязуць на поле.—Замест ямы можна рабіць компост у кучах; тады трэба кучы перэкапываць, прабіваць ў іх калом дзіркі і туды ліць памыі, гнаёўку.

Але ж лепшая падсьцілка і лепшы гной будзе не з гэтаго торфу, што як цеста і ляжыць на самым сподзе, а з *верхніх пластоу* торфянішча, гдзе торф не так ешчэ перапрэў. Калі ўзяць гэткі торф ў рукі, то ён як мох, ня пэцкае рук. Ён больш жоўты, і з яго можна выцісnуць ваду, як з губкі. Гарыць ён не цікава, і як капаюць торф на апал, то верхніе пласты скідаюць на бок.

На торфянішчы, гдзе хочуць нарэзаць гэтаго торфу-моху, капаюць неглыбокі равок, каб асушыць трохі балота; тады *вострай ценкай лапаткай с простым, а не круглым канцом* рэжуць акуратне рад за радам цэглы. Цэглы гэтые складаюць на сухім мейсцы ў клеткі, каб торф добра прасох. Цэглы даўжыні 10—13 цалей, шырыні 4—6 ц., грубіні 3—4½ цалі. Такіе ўжо сухіе кавалкі торфу-моху звозяць да дому и кладуць пад стрэху, каб не замоклі. Гэтые цэглы торфу-моху прад тым, як падсьцілаць у хлеў, трэба *канечне* разбіць у дрэбязу; вось іх і прапускаюць ці праз сечкарню, ці праз корнерэзку, ці штыфтовую малатарню, бо скаціна не заўсягды може цэглы разбіць нагамі. Для гэтаго ёсць і асобные машыны. Калі-ж астануцца непабітые кавалкі

і іх вывязуць на поле, то яны так і астануцца і будуць шкодзіць полю.

Трэба столькі разбіваць цэгел, колькі трэба на падсьцілку на адзін раз. Падсьцілка з гэтаго торфу надта цягне ў сябе макрату, і лепш торф трымаць на памосьці з досак пад стрэхай, каб сыпаць у хлеў сухі.

Карысць с торфо-моховой падсьцілкі вось якая. Торфу менш выходзіць, як саломы, больш гною і добраго збіраецца, не прападае рэдкі кал, каторы лепшы ад сухога, у хлявох будзе і чысьцей, і сушэй, ды нема смуроду.

Торф-мох моцна ўцягівае ў сябе ваду. Пуд саломы можэ ўцягнуць $2^1/_2$ пуда вады, а пуд торфу-моху—ад 8 да 14 пудоў вады. На адну карову саламянай падсьцілкі трэба на год 250 пуд., а торфо-моховой—78 пудоў; для каня 120 пуд. саломы, а торфу—38 пуд.; для сьвіньні 14 пудоў саломы, а торфу—8 пуд. Карова (добрая) дае цьвёрдаго калу ў год 500 пудоў, у гэтым кале будзе 428 пуд. вады; а рэдкаго калу карова дае ў год 628 пудоў. Дык вось, каб усё гэта рэдкае не прападало, трэба ў хлеў сыпаць мохо-торфяны парашок: ён (калі яго досі сыпаць) можэ ўцягнуць і трымаць ў сабе ўсю гнаёўку, і яна не прападае. Пры нашых рахунках, торфу прыходзіцца ў дзень на 1 карову $8^1/_2$ фунтоў, на каня $3^1/_2$ фун., на сьвіньню—1 фунт.—У хлявох заўсягды бывае цяжкі дух ад калу, ён аж рэжэ вочы—гэта выходзіць *амм як ці аммоніяк* (такі газ); гэты аммiяк канечне патрэбны для расьлін і для поля. Вось торф ўцягівае ў сябе і той газ, і ён не прападае, дый скаціне здаравей ад чыстасьці.

Торфу першы раз падсьцілаюць у хлеў па 1 ці $1^1/_2$ пуда на галаву, а потым што-дзень падкідаюць па фунты тры туды, гдзе ўжо мокра. Калі ўвесь гной макраваты, то трэба перэвярнуць яго і насыпаць новы пласт торфу; можна падкідываць і саломы. Некаторые радзяць не трымаць гною ў хлеве больш 1—2 нядзель; потым кажуць выкідаць ў кучу (як гэта заўсягды робіцца ў лепшых гаспадарках)...

Кубічная сажэнь сухіх цэгел торфу-моху важыць ад 40 да 60 пудоў. Вырабіць 1 пуд каштуе 5—6 кап.

Кнігі аб торфовай падсьцілцы ёсць такіе:

1) Торфо-моховая подстилка. П. М. Соловьева изд. Девріена ц. 4 коп.

2) Torf i jego zastosowanie w rolnictwie. W. Kotłubaj cena 1 rub.

3) Torf, jego pochodzenie i pożytek w gospodarstwie włościańskim. W. Kotłubaj, c. 10 kop.

Хто хочэ дастаць прэйс-курант аб машынах для торфу, нехай напішэ аткрыткі адрэсуючы:

1) Рига. Завод Фельзера і К-о.

2) Вильня. Склад машынъ З. Наградзкаго.

3) Варшава. Alfred Grodzki. Senatorska, 33.

4) Влоцлавск, Варш. г. фабрика Mihsama.

**Гаспадар.**

---

# ТАННЫ АПАЛ (ТОРФ).

Часта дзеці гуляючы, адкрываюць такіе рэчы, ў каторых многа карысьці. Вось гэтак было і ў нашым сяле Вялікай Ліпе, Навагрудзкаго пав. Мінск. губ.

Вядома ўсім, што ў Беларусі шмат балот, але што ў гэтых балотах ляжыць багацтва вялікае—*торф*, ня кожны знае. Торфам можно паліць у печы, угнаіваць поле; робяць з яго нават тканіны, а ёсць такіе гатункі торфу, што можна даваць як корм скаціне...

Першые ў нас скарысталі з балотнаго апалу нашы ліпоўскіе дзеці. Яны, пасучы быдла, збіралі сухіе кавалкі торфу, раскладалі агонь трэсачкамі і торф гарэў добра: на ім пяклі бульбу, грэліся. Селяне чулі, што торфам паляць, але самі не браліся за гэта: нігдзе яны ня бачылі, як гэта робіцца. Беларус верыць „не сказу, а паказу“. Даводзілі іншые, бытцам торф гарыць толькі на паветры, а ў печы гарэць ня будзе.

А трэба сказаць, што наша Сноўская воласць надта голая на дровы. Свайго лесу нема, купляць трэба, а грошы мала. Мерзлі селяне па хатах, ляпалі зубамі, ня ведаючы, што топчуць на балоце дровы дармовые.

Але ў нас кажуць: „голы на выдумкі хіцер“. Жыве ў нас кравец Андрэй, мае бадай не капу дзяцей, круглый год купляе хлеб. Нехват грошэй ня толькі на дровы, але і на хлеб! Хата Андрэя стаяла каля выгану—балота. Наглядзеўся ён, як дзеці торф паляць, набраў кускоў сухога торфу на балоце, прынёс у хату, наклаў у печы і падпаліў трэскамі. Торф як на дзіва стаў гарэць. Гарэў ён даўжэй, як дровы, але добра напаліў печ; зварыла на ім Андрэіха і снеданьне, і палудзень, а агонь усё трымаецца у прыску цэлую пару.

Пасьля гэтаго ўзяў Андрэй лапатку, выйшоў з дзецьмі на балота і стаў капаць торф у запас. Прайшло тыднёў шэсць, торф высох і быў гатовы на апал. Андрэй знёс торф той да дому і стаў паліць ім у печы.

Сьмеялiся некаторые з Андрэя, што ён балотам палiць у печы i гатуе есьцi. Але наш Андрэй не зварочваў нiякай увагi на гэты сьмех i толькi цешыўся, што ў хаце цёпла i ёсць на чым зварыць страву. Праз неякi час нагледзелiся людзi, як гарыць у Андрэя торф, спрактыкавалiся сам, якая карысць з яго, i на другi год многа гаспадароў сталi капаць торф на зiму. Патроху уся вёска стала апалiвацца торфам, а цяпер i ўсе суседнiе вёскi робяць тое самае.—Накладуць у печ торфу, палажаць пад спод запалiўшы кусок смаляка, лучыны цi сухiх трэсак, i торф пайшоў гарэць, аж мiла! У зiмку ў нашых хатках стала далёка цяплей i сушэй. Пякуць, смажаць, нават самавары ставяць — усё на торфе.

Праўды, як цiхай ранiцай пад'ежджаеш да нашаго села, то ў паветры чуць як-бы спаленiзнай: дым такi ад торфу. У хатах так сама крыху задаюць паху гэтые балотные дровы. Але гэта не беда! Як камiны цэлые i люфты спраўные, сапухi ў сярэдзiне мало i цяг добры, дык торф гарыць зырка i не чуваць нiякаго смуроду. Трэба помнiць i глядзець адно, каб торф перэгарываў саўсiм да тла, i не сьпешацца зачыняць камiноў, а то ў попелi астаецца часта неперэгарэлы торф i наробiць многа чаду. Шмат дае цепла i добра гарыць торф у печах, лежанках, грубках; толькi часта трэба выбiраць попел, катораго пасьля торфу астаецца больш, як пасьля дроў. Але гэты попел вельмi карысна сыпаць на сенажацi, паля: ён лепш усякаго гною.

Мельнiкоў Ез к.

---

# Дзесяць заповедзей для вескоВаго гаспадара:

1) якiм зерном пасееш, такi i колас вырасьце;

2) не пачынай араць, пакуль баразна блiшчыць, а то яе не разбаронуеш;

3) не заорывай гной глыбока i ў мокрую землю, бо ён не дасць карысьцi пасеву;

4) менш перэкiдай землю плугом, а часьцей бярыся за барану;

5) не скародзь зяб на зiму, бо земля лiшне злягаецца;

6) чым скарэй заарэш канюшынiшчэ, тым лепшае будзе жыто;

7) забудзь, што троілі пад жыто—забудзеш, што не радзіло жыто; ў той час, калі бацькі троілі, перайдзі папар бараной;

8) ад орыва да пасеву жыта пачэкай два тыдні;

9) менш дзяржы скаціны, лепш кармі—збярэш гною і больш, і лепшаго;

10) калі ня ведаеш, як што рабіць у гаспадарцы,—зайдзі парадзіцца да людзей, сьведомых у гэтым.

**Бусел с-пад Слуцка.**

---

# Якая карысць ад пасеву трау?

Завясьці пасеў траў на селянскіх грунтах—справа вельмі карысная і не так ужо мудрая, каб ня можна было яе зрабіць; трэба толькі раз ці два разы купіць насеньня і пасеяць вясной паверх жыта, або якой небудзь яравой збожыны. Асобне абрабляць зямлю пад канюшыну, ці іншые пасеўные травы ня трэба; земля пад травамі не пустуе, бо праз першае лета, калі яна ешчэ не косіцца, на ёй расьце жыто ці авёс.

Дзеля таго толькі, што селяне ня ведаюць карысьці с пасеву траў, гэты важны адростак сельскай гаспадаркі у іх не пашыраецца.

Карысць з палевога пасеву траў бывае троякая: 1) земля будучы пад травамі, а асобне канюшынай, знаходзіцца як бы пад папаром, 2) канюшына сама сабой угнаівае зямлю, і 3) без вялікіх клапотоў дае гаспадару шмат добрай і сытнай пашы.

Разгледзім апошняе і самае глаўнае.

Скажэм, што селянін валадзее кавалкам зямлі на 2 сахі. Гадуе ён 3—4 каровы, 2 кані, с каторых мае 120 невялікіх возікоў гною. Ураджай у яго бывае сам 3—4. Нехай ён падзеліць сваю пахату на 4 полі і на адным з іх будзе засеваць жыто, на другім ярыну, на трэцім будзе папар, на чацьвёртым канюшына. С практыкі ведама, што на тым жэ кавалку, дзе у селян засеваецца 5 пудоў жыта, трэба засеяць 70 фунтоў канюшыны, дзеля таго, што тут будзе каля 2 дзесяцін. Калі лічыць, што дзесяціна канюшыны дасьць каля 250 пудоў, то з двох дзесяцін будзе каля 500 пудоў сена. Гэтым сенам сьмела можна пракарміць дзьве-тры лішніе жывёлы, каторые сваей чэрадой дадуць каля 40 вазоў гною, і такім парадкам яго ўжо будзе вывозіцца ня 100—120 вазоў, але 180—200. Але гной гэты паложыцца не на

тые нівы, гдзе перш высевалося больш збожыны, але на меншу блізка на тры чверткі ніву, або зямля будзе угноіваецца двойчы лепей, чым перш да пасеву канюшыны. З гэтай прычыны і ураджай збожжа павінен пабольшыцца.

Апрача гэтаго ураджай звялічыцца ешчэ і дзеля таго, што земля аддыхала пад канюшынай ня год, а два гады, ды ешчэ канюшына, як было сказано, сама сабой, сваімі карэньнямі угнаівае зямлю. Пры такіх варунках можна сьмела чэкаць ураджаю не сам 3—4, а прынамсі 5—7, т. ё. пры палевым пасеві траў будзе селянін мець свайго хлеба больш у поўтары раза, чым пры трохпалёўцэ.

Цяпер палічым, пачым абыйшоўся сабе пуд канюшыннаго сена. На дзьве дзесяціны было пасеяно 2 пуды канюшыны па 8 рублёў за пуд—16 руб. і 20 фунтоў цімафееўкі, каля 2 рублёў; усяго 18 рублёў. А дзеля таго, што раз пасеяная канюшына расьце на адным і тым самым мейсцы праз 2 гады, то будзем лічыць, што скасілі мы канюшыны ў першым гаду 500 пудоў, на другі 400 пудоў, усяго—900 пудоў. Значыць, калі не лічыць арэнды зямлі і збор сена, то абышлася нам канюшына па 2 капейкі за пуд.

---

# Аб лубіне.

Ўселякае село мае далёкіе палеткі, што іх называюць у нас наддаткамі. Земля там сама па сабе такая, як і на сядзібе, але вазіць туды гной трудно, бо яго ў нашай гаспадарцы мало і вазіць за вярсты тры ня кожны гаспадар можэ. Дык земля і родзіць дрэнна. На такіх палетках сеюць жыта, потым поле гуляе два гады, пасьля сеюць грэчку. Нажне тамака гаспадар жыта капы чатыры з морга,—значыць, на год выпадае пудоў дзесяць зерня і пятнацаць саломы.

Такіе далёкіе і слабые палеткі лёгка паправіць; трэба толькі іх *падкарміць*, але не гноем, а *лубіном*.

Можэ вы бачылі лубін гдзе у дварэ—расьце ён як боб. Гэта—зельле, каторае, калі яго прыарэш, дае так сама шмат карысьці, як гной. Лубін сеюць вось як.

Пад лубін трэба ўзараць поле з восені; вясною выскародзіць, узараць ешчэ раз; перад сяўбою разбіць баразну бараною, каб зерне не западало залішне глыбока ў зямлю; тады ўжо сеяць дзесяць пудоў на морг.

Лубін спачатку слаба расьце, баіцца травы і зельля, так што найлепш яго сеяць на картоплянішчы. Але як пяройдзе 3—4 тыдні, дык і не агледзішся, як ён шыбане ў гару і зацьвіце.

Прыорываць лубін трэба тады, як на ім пачынаюць завязывацца струкі. Прыараўшы, чэкаюць два тыдні, пакуль земля добра абляжэ, і тады сеюць жыто.

Пуд лубіну каштуе ў нас поў рубля або чатыры злоты; значыць, каб добра угнаіць морг зямлі, трэба аддаць рублёў пяць—шэсць. Але за гэтые грошы нажнеш з морга ўжо не чатыры капы жыта, а *восем*,—прыбудзе шмат і зерня, і саломы

Лубін дае карысць ня толькі адно як гной: сваімі карэньчыкамі ён выцягае з зямлі, якліваром, стары перагной, што гадамі сьцекае ў глыбь зямлі. І таму грошы, што аддасі за яго, вернуцца вельмі скора.

**Бусел с пад Слуцка.**

---

## Як спазнаць, які штучны гной патрэбен для нашай зямлі.

Каб задарма не траціць многа грошы на куплю штучных гнаёў, трэба найперш зрабіць пробу на сваей зямлі і даведацца, ці можна падняць ураджай на ёй штучным гноем. Гэта можна зрабіць такім чынам: узяць кавалак у 240 квадратных сажнёў і раздзеліць на 4 дзелянкі, па 60 кв. сажнёў у кожнай, угнаіць такімі штучнымі гнаямі, якіе тут ніжэй паказаны, і засеяць якой небудзь збожынай (аўсом, жытом).

Дзелянка I і IV астаўляюцца не угноенымі і II III пасыпаюцца такімі вось гноямі:

**Для цяжкіх зямель:**

| | | |
|---|---|---|
| супэрфосфату . . . . . | 24 | фунтоў. |
| 30% калійнай солі . . . | 6 | „ |
| Чылійскай салетры . . | 5 | „ |

**Для лёгкіх зямель.**

| | | |
|---|---|---|
| томас-шляку . . . . . | 36 | фунтоў. |
| каініту . . . . . . . | 36 | „ |
| Чылійскай салетры . . | 8 | „ |

Другое, вельмі важна разгадаць такое пытаньне: якіе гнаі больш за ўсё пабольшуюць ураджай палёў і, само сабой, чаго не стае глебе: калі, азоту, ці

фосфорнаго квасу? Атказ на гэтае пытаньне дае такая проба: бяруць, напрыклад, кавалак у 300 кв. сажнёў кожны, гноюць ніжэй паказанным способам і засеваюць якім небудзь збожэм. Адну дзелянку астаўляюць нічым ня ўгноенай, на другой разсыпаюць супэрфосфату 24 ф., калійнай солі 9 ф., салетры 6 ф.; на трэцей—супэрфосфату 24 ф., калійнай солі 9 ф,; на чацьвертай—супэрфосфату 24 ф.. салетры 6 ф. і на пятай—калійнай солі 2 ф., салетры 6 ф.

Калі збожына дасьпее, зжаць яе, вымалаціць зерняты і асобне салому зважыць з кожнай дзелянкі па асобку. Зраўняўшы з негноенай дзелянкі можна ўцяміць, якіх штучных гнаёў найбольш земля патрэбуе.

Сеючы гнаі, канечне трэба пільнавацца вышэй апісанай рады, што датычэ гатункоў і вагі гнаёў.

---

# Як выбіраць добраго рабочаго каня.

Кожны гаспадар ведае, як трудна гадаваць добраго рабочаго каня, а купіць на кірмашы ешчэ трудней. Усе мужыцкіе коні „слабосільные“ дзеля таго, што яны кепскай будовы, а пры тым і харчуюцца слабо. Наш селянскі конь ня выарэ больш у дзень, як поўморга лёгкай зямлі, а на глею, альбо ў цэліне саўсім не пацягне плуга. Зімой прыйдзецца вазіць дровы з лесу, дык ледзьве забяруць сажэнь на пятнадцать вазоў. Добры хорч многа памагае ў рабоце каню, але ёсць коні кепскай будовы і іх як ні кармі, ўсё роўна карысьці мець ня будзеш. Такі конь скора пацее, цяжка дыхае і дробнымі крокамі ледзьве цягне плуг. Пагаворым цяпер, якой будовы павінен быць гаспадарскі конь, каб ён быў прыгодны да ўсякай работы.

У добраго, моцнаго каня галава павінна быць вялікая, с шырокім лобам і патыліцэй, вушы не вісячые, як у каровы (асьцерэгайцеся „клаповухіх“ каней), бо ўжо па вушах відаць, што конь слабасільны і ляны. Апрача таго абвіслые вушы бываюць у старых каней. Вока ў каня павіно быць вялікае, круглае, ня косае, вясёлае і рахманае, а не запаўшае і хмурнае. Купляючы каня, трэба добра прыглядзецца к вачам, ці шэрсць пад вачамі не абапрэла ад сьлезы, ці конь не баіцца, калі рукой пагладзіць каля вока, бо калі пачне пужацца, дык значыць, што каню ўжо лячылі вочы. Губы у каня павінны быць моцна сціснуты, бо калі ніжняя ўжо

вісіць, вочы запалі, вушы апусьціліся на бакі, то значыць, што конь спрацаваны і з яго карысьці ня будзе Аглядаючы галаву, ня шкодзіць залажыць руку пад сківіцы і паглядзець, ці нема там якіх гузікоў; памеж сківіц павінен улазіць свабодна кулак, бо калі сківіцы шырока пастаўлены, то і гарляк свабодна там стаіць, а ў цяжкай працы, або ў ездзе па гарах такі конь не засапецца.

Вялікая, цяжкая галава павінна сядзець на тоўстай шыі, бо тонкая і доўгая шыя ў каня паказывае, што ён да работы мало варт. Калі ў каня ёсць пад горлам якіе скулы, ды ешчэ з ноздроў ідзе гной, дык такога каня нельга купляць, бо ня толькі ён сам здохне, але заразіць усю жывёлу, а пад час і людзей. Аглядаючы шыю у каня, трэба адгарнуць грыву і паглядзець, ці конь не замуліваецца і ці нема там балячэк, бо часта пад грывай бываюць фістулы, што ніколі ня гояцца, іх называюць „*нарыца*“.

Грудзі ў каня павінны быць шырокіе у лапатках і глыбокіе; коні з вузкай грудзінай замуліваюцца, кашляюць і часта бываюць з дыхавіцай. Дыхавіцу лёгка спазнаць вясной у каня на траве, дык трэба добра прыгледацца к пахвінам, і калі конь цяжка дыхае, кашляе і пахвіны ўздымаюцца „з падхватом“, як у гармоніцэ, то ў гэтаго каня напэўно дыхавіца, і яе вылячыць ня можна.

Спіна у каня павінна быць шырокая. Коні с шырокай спінай маюць шырокі зад, і ногі у такого каня пярэдніе і задніе стаяць шырока адна ад аднэй, а крыжавые коні да работы не здатны. Шырокім канём мы завём каня шырокай косьці, а не тлустаго, бо часта бывае, што як конь да работы нездатны, дык яго аткормяць атрубямі і бульбай і прадаюць за добрые грошы. А чэлавек без практыкі купляе і думае, што купіў „асновістаго“ каня.

Чэрэво у каня не павінно быць вялікае, абвіслае, бо такіе коні, „мякіннікі“, як іх у нас называюць, да працы слабасільные.

Ногі у каня не павінны быць доўгіе і тонкіе, бо на тонкіх нагах конь ходзіць як на хадулях, а працаваць ня можэ. Апроч гэтаго трэба глядзець, каб хахол ля капыта ня быў доўгі і лежачы, бо такіе ногі у каня скора псуюцца. Аглядаючы ногі, трэба добра абмацаць капыты, бо капыты з трэшчынамі, уздоўжнымі, ці ў поперэчнымі, надта шкодзяць каню, і іх ніколі ня вылечыш; а канюхі умеюць замазываць смалой шчыліны на капыце, каб не відаць было задзірын і трэшчын. Капыт не павінен быць тоўсты, „лапцеваты“, бо такіе коні ня

могуць працаваць без падкоў. Капыт павінен быць „каппаваты“, слаісты, з добрай глазурай. Маючы капыт у руках, трэба падняць ногу і поглядзець з нізу, ці стрэлка цэлая і не гніе, бо як толькі смярдзіць і выцекае гной с капыта, то такога каня купляць нельга. Калено у каня павінно быць шырокае, мускулы добра відны ад лапаткі па ўсей назе.

Купляючы каня, трэба ўзяць яго з рук канюхоў і адвясьці ў заціштэк, а пасьля прабаваць вадзіць ступой, трухтам, праехаць верхом і запрагчы ў цяжкі воз. Конь павінен лёгка выкідаць пярэдніе ногі і шырока стаўляць задніе. Калі конь будзе як бы кульгаць на пярэднюю нагу, то трэба прабаваць на бягу завярнуць яго крута на той бок, на каторую нагу ён кульгае, а калі здаецца, што кульгае на заднюю нагу, то трэба асадзіць каня назад крокоў на пяць, а тагды зноў уперэд. Калі конь сапраўды хворы, дык зараз пачне кульгаць.

Ня варто купляць вялікіх каней, бо і не ў велічыне каня сіла, дый з вялікім канём многа клопату гаспадару—ані на пашу яго пусьці, ані з рук гадуй. Самы лепшы конь—гэта мерны, ростам 2 аршыны і два вершкі, а меншые не вытрамываюць цяжкай працы.

Мы тут разгледзялі усе прыкметы добраго рабочаго каня, але гаспадар, купляючы яго, павінен звертаць увагу ешчэ і на зубы. Па зубах можна пазнаць гады каня, але толькі па пярэдніх на дольняй сківіцы. Зубы гэтые называюцца *рэзцамі* і іх у каня шэсць: два крайніе называюцца *акрайкамі*; два зубы, седзячые памеж двума акрайкамі, называюцца *сярэднімі*, і два, седзячые ў сярэдзіне памеж сярэдніх—*зачэпамі*. Па гэтых зубах і пазнаюць, колькі гадоў каню.

Хто хочэ сам выгадаваць добраго каня, той павінен добра пільнаваць свае кабылы, добра яе карміць, не браць да надта цяжкай работы і злучываць з добрымі жэрэбцамі, не шкадуючы грошэй на жэрэбца, бо гэтые грошы заўсягды вернуцца з д брым даходом.

Жэрэбцам да 1 году трэба даваць авёс і добрае сено, бо як пачнеш жывіць чэрэво кепскім сенам, то ня вырасьце конь з добрымі касьцямі і мускуламі.

**Юрка Бусел с-пад Слуцка.**

# Як выбіраць карову?

Мужыцкая гаспадарка вядзецца ў нас, як кажуць, не на снасьці, а на шчасьці.—Зямлі мала, дый тая без ладу прападае ў шнурох, і жывёла трымаецца толькі

дзеля гною, а сам мужык малограматны перэкідаецца на гэтым сьвеце не розумом навукі, а толькі хітрасьцю. Каб ешчэ можна было дастаць грошы на папраўку гаспадаркі за малы процэнт, то можэ як нашы гаспадары і аправіліся бы трохі ад бяды, а тым часам дрэнна ім жывецца.

Вялікі капітал у мужыцкай гаспадарцы гэта жывёла і праца гаспадара і ўсей яго сямьі, а наш беларус ні таго, ні другога не ўмее цэніць.

Трымаюць у нас гаспадары многа жывёлы, але на лік, толькі—хвасты; кепска худобу кормяць і у сваіх гавяд купляюць за дарагіе грошы кепскі гной, а сам гаспадар з усей сямьёй прападае без малака і масла, дый пры плузе памагае каню, як другі конь. У канцы года лічыць гаспадар сваё дабро, і выходзіць, што ўсё тое з'еў, што зарабіў, а на чорную гадзіну не было аткуль адлажыць рубля. Ня добра гаспадару ў наймiты ісьці, але каб прышлося паслужыць год з усей сваей сямьёй, дык адлажыў бы трохі карбованцоў; чамуж ён на сваей зямлі ня можэ зарабіць? А за тым, што ня ўмее лічыць, а гспадарка без рахунку нічога не варта.

Вось, пагледзім, што каштуе гной у мужыцкай гаспадарцы і чаго ён варт. Аднэй каровай, слаба харчуючы, гаспадар скорміць за зіму 80 пудоў сена, 120 пудоў саломы і 40 пудоў мякіны; палічыўшы сена па 20 к., а салому і мякіну па 15 кап., выпадае на зімовые харчы для аднэй каровы 40 руб., а летняя паша і пастух варты 6 руб. Гэтак у год выпадае 46 р. Такая карова дасць 150 гарцоў малака і кепскае целя; малако варта 15 руб., целя—3 руб., разам даходу 18 руб., а расходу 46 руб. Значыць, гной ад аднэй каровы абходзіцца 28 руб., а так слаба кормленая карова дасць ня больш, як 20 вазоў (500 пудоў) кепскаго гною; выходзіць, што пуд гною каштуе сабе 5 кап., а як на дзесяціну трэба яго 90 вазоў (2400 пуд.), то каб выгнаіць дзесяціну поля, трэба заплаціць 120 руб.—Дый такі саломісты гной не дасць больш пажывы зямлі, як на тры гады; дык ў адзін год выпадае 40 руб. за гной.

Гэтак кормленая карова з'едае ўсю салому, і яе не хватае на падсьцілку, вось з зімы выходзіць яна худая і вясной найлепшы час траціць на тое, каб прыдаць сабе трохі цела (мяса), а малака гаспадару не дае.

Паглядзім цяпер, які выпадзе рахунак, каб гаспадар трымаў менш кароў і лепш іх карміў, а салому пакідаў на падсьціл, на лета. Каб карова трымалася ў цепле і добра давала малака, трэба ей даць такі корм: 10 фунтоў сечкі с сена, 10 фунтоў сечкі с канюшыны, 10 фунтоў сечкі з яравой саломы, папалові з мякінай,

і 10 фунтоў бульбы. Будзем лічыць, штожывёлу трэба карміць з рук 200 дзён, дык на зіму выпадае 50 пудоў сена, 50 пудоў канюшыны, 50 пудоў яравой саломы, 50 пудоў бульбы. За сена плацяць па 20 кап., канюшына па 25 к., яравая салома па 15 к. і бульба па 15 к., паша летняя і пастух 6 р. Гэтак ў год каштавацьме хорч каровы 43 р., але такая карова дасць пэўных 350 гарцоў малака—за 35 руб. ды целя, каторае будзе варта 7—8 р.; вось гной прыйдзецца тады дарма, а гною ад такой каровы будзе шмат больш і лепшаго—з клёкам; такі гной дасць карысць полю не на тры годы, а на шэсць.

Добра кормленая карова раней пабегае і ў восень ацеліцца, а у нас кажуць, што як карова ў восень целіцца, дык усё роўна, як бы яна два разы целіцца, бо дасьць малака праз усю зіму, потым выйдзе на пашу тлустая і ізноў будзе даваць добра малако.

Ня кожны гаспадар можэ выгадаваць сабе добрую карову, а часта прыходзіцца купляць на кірмашы. Тутака не раз мужыка ашукаюць, бо не ўсякі умее пазнаць добрую малочную карову. Каб памагчы людзям у гэтай бядзе, пагамонім, як пазнаць добрую малочную карову.

Пачнём аглядаць карову ад галавы: галава павінна быць не вялікая, сухая, с тонкімі рагамі, лоб вузкі, вочы рахманые і вясёлые, вушы вялікіе, морда мокрая, зубы моцные. Бугаеватая галава—самая кепская. Шыя павінна быць тонкая, доўгая з мягкай скурай, каб збіралася ў складкі і вісела пад грудзінай. Корпус (ўсё цела) каровы павінен быць даўгаваты, хрэбет—роўны, рэбры тонкіе і крутые з добрым прасьветам, (каб памеж рэбер змясьціліся тры пальцы). Зад у каровы павінен быць шырокі, хвост стойкі і доўгі, ногі нізкіе і простые з добрымі капытамі (сьцеражыцеся клышавых і цыбатых кароў). Але самае важнае у каровы гэта вымя: вымя павінно быць вялікае і мягкае (не мясістае), выдаіўшы карову, на вымені павінны рабіцца складкі і, ўзяўшы рукой за вымя, можна яго адцягнуць, як рэзіну. На вымені павінны быць цыцкі тоўстые і караткаватые, а вымя без валасоў. Трэба аглядаць добра цыцкі, каб не было папсаваных. Жылы на чэрэві ад вымені да пупа павінны быць тоўстые, з гузочкамі, каб іх можна было разгледзяць, не мацаючы рукой.

Па рагах і зубах можна пазнаць, колькі гадоў карове: на рагах каровы робяцца кружкі—рубцы пасьля кожнаго целяці, а ведама ўсім, што карова целіцца не раней, як 3-х гадоў; дык калі ўгледзіш, што на рагах, напрыклад, рубцы тры,—значыць, карове шэсць гадоў.

Добрая карова павінна быць рахманая, не баяцца чэлавека, стаць спакойне і не затрымываць малака.

Іншые гаспадары думаюць, што толькі „завадзкіе“ каровы даюць многа малака, а я вам кажу, што можна выбраць і з мужыцкіх кароў важные, даць ім добры хорч, і яны багата заплацяць за корм.

Ешчэ адна беда, што ў нашых мужыкоў кепскіе хлевы для жывёлы; жывёла, мерзнучы з мой, спажывае многа корму без карысьці, толькі каб абагрэцца, і гной прамерзае і псуецца, і целяты адмарожываюць вушы і хвасты, а гаспадару ў цёмным хлеве не заўсягды відаць, калі жывёла хворая альбо калі ёй трэба даць якую помач, дый жывёлі на вочы шкодзіць цемната, так як чэлавеку цямніца.

**Юрка Бусел с-пад Слуцка.**

---

# Соль для скаціны.

Вядома, што чэлавек без солі абыйсьціся ня можэ, так сама і жывёла патрэбуе солі к свайму корму, каб корм гэты быў страўнейшы ёй і каб жывёла здаровай была. Вучоные гаспадары рабілі вось такіе пробы: ставілі колькі кароў у хлеў і давалі адным каровам засаліўшы, а другім саўсім без солі. Праз месяц тые каровы, каторым дадавалі ў корм соль, шмат паправіліся на целі, шэрсць на іх зрабілася гладкай, бліскучай, давалі больш малака і былі шмат весялейшымі за тых кароў, каторым не давалі солі. Проба гэта паказала, што, каб скаціна была здаравейшай, трэба ёй дадаваць у корм солі.

Ў кожным корме: сене, канюшыне, саломе, ёсць малая доля солі, каторую расьліна павыцягівае з зямлі, але солі гэтай мала для жывёлы, каб магла яна саўсім здарова гадавацца.

Па сёлах здараецца бачыць, як жывёлы, варочаючыся з паствы, шукаюць самі сабе солі: каровы і авечкі астанаўліваюцца грамадамі пры дамох і ліжуць падмуроўкі, грызуць косьці, суконные скуматы, ліжуць па-след людзкі,—авечкі згрызаюць адна у другой воўну, коні грызуць яслі і жолобы започэные. Жывёла сама стараецца знайсьці соль, а ведама неразумнае стварэньне, замест памагчы, часта толькі шкоду сабе робіць: каровы, напрыклад, часта давяцца касьцямі, авечкі, палыкаючы воўну, хварэюць і здыхаюць, коні грызучы дрэва псуюць сабе зубы.

Вось і выходзіць, што добры, дбалы аб сваёй жывёлі гаспадар, павінен дадаваць сам солі у корм.

Трэба толькі асьцерэгацца, каб не перадаць лішне, бо гэта так сама шкодзіць.

Коням і каровам трэба дадаваць 2—3 лоты (ў фунце 32 лоты), солі ў дзень на галаву, авечкам і сьвіньням ня больш 1 лота. Соль можна дадаваць жывёлам, паліваючы салёнай вадой сухі корм, і можна саліць адразу ўвесь запас корму, складываючы ў пуню з восені. На 10 пудоў сена сыпецца два—тры фунты солі.

Я. Буда.

---

## Шэсьціпалёука на 5 дзесяцінах.

Пры шэсьціпалёўцэ земля не бадзяецца пад папарам, сеецца больш канюшыны, вікі (больш корму, больш гною, больш ураджаю), земля адпачывае пераменай расьлін і палепшаецца. Можна і на шнурох вясьці шэсьціпалёўку, дзелючы кожнае поле на дзьве часьці.

| Трохпалёўка. | Жыта. | | Ярына. (Конюшына) | | Папар. | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 год | 1 поле бульба (поўгноя) | 2 поле авёс (канюшына) | 3 поле канюшына | 4 поле папар | 5 поле жыта | 6 поле жыта (поўгноя) |
| 2 год. | 1 авёс (канюшына) | 2 канюшына | 3 жыта (поўгноя) | 4 жыта | 5 бульба (поўгноя) | 6 віка, гарох |
| 4 год. | 1 (канюшына) | 1 жыта (поўгноя) | 3 віка, гарох | 4 бульба (поўгноя) | 5 авёс (канюшына) | 6 жыта |
| 4 год. | 1 жыта (поўгноя) | 2 віка, гарох | 3 жыта | 4 авёс (канюшына) | 5 канюшына | 6 бульба (поўгноя) |
| 5 год | 1 віка, гарох | 2 жыта | 3 бульба (поўгноя) | 4 канюшына | 5 жыта (поўгноя) | 6 авёс (канюшына) |
| 6 год. | 1 жыта | 2 бульба (поўгноя) | 3 авёс (канюшына) | 4 жыта (поўгноя) | 5 віка гарох | 6 канюшына |

1) Пры гэтай шэсьціпалёўцэ трэба віку парой скасіць і зараз жэ заараць вікаўё, не даўшы зямлі абсохнуць. Да жытняй сяўбы скіба павінна пралежаць ня менш 2 тыднёў.

2) У першым гаду гаспадар можэ ешчэ папасьвіць скаціну на папары (4-ае поле), а на другі год павінен запасьціся харчамі і хаваць скаціну ў хляве да канца мая; тады ужо будзеш пасьвіць на часьці канюшыны (2ое поле) на вяроўцы, пазней будзеш падкармліваць кошанкай (віка).

**Колькі дабра збіраецца з 5 дзесяцін пры трохпалёўцы.**

| | | |
|---|---|---|
| Збожа. . . . . . . | 185 пудоў | на 146 рублёў. |
| Бульбы. . . . . . | 250 „ | „ 50 „ |
| Корму скаціне . . | 193 „ | „ 29 „ |
| Разам . . . | 628 пудоў | на 225 рублёў. |

Уселякай саломы выйдзе каля 320 пудоў.
Ды корму скаціне „ „ 193 „
Разам . . . 513 пудоў.

Гною выйдзе з гэтаго каля 1100 пуд. (55 вазоў).

**Колькі дабра збіраецца з 5 дзесяцін пры шэсьціпалёўцы.**

5 дзесяцін гэта будзе $7^1/_2$ маргоў. — 1 морг 1600 квадратных сажэн.

| | | Пудоў. | Каштуе: рублёў. | Каштуе: Кап. |
|---|---|---|---|---|
| $1^1/_4$ морга | Бульбы | 540 | 108 | — |
| $^3/_4$ „ | Аўса | 50 | 37 | 50 |
| $^1/_2$ „ | Ячменю | 40 | 32 | — |
| $2^1/_2$ маргі | Жыта | 150 | 127 | 50 |
| $1^1/_4$ морга | Канюшын. | 300 | 90 | — |
| $1^1/_4$ морга | Вікі (кошанкі) | 200 | 50 | — |
| Разам $7^1/_2$ мар. | — | 1280 п. | 445 руб. | — |

Саломы уселякай выйдзе . . . . 435 пудоў.
Канюшыны і вікі . . . . . . . . . 500 пудоў.
Разам . . . . 935 пудоў.

З 935 пудоў выйдзе гною 2000 пудоў. Ешчэ больш гною дасць бульба для сьвіней.

Поўны гной называецца, калі на 1 дзесяціну (2400 квадратных сажнёў) кладзецца 2400 пудоў гною (120 вазоў). Поўгноя гэта—1200 пудоў (60 вазоў) гною.

# Якіе невыгады шнуравой гаспадаркі.

*(З „Хутара Бобоуня" Наша Ніва № 6—7 1909 г.).*

1) Шмат зямлі ляжыць надта далёка ад сялібы. Палавіна часу траціцца на работу, а палавіна на дарогу. Кожны гаспадар можэ аблічыць, колькі ён у год пройдзе лішніх вёрст, каб дабрацца да сваіх кавалкоў, што раскіданы на колькі вёрст.

2) Многа зямлі прападае на межы пры доўгіх шнурох.

3) Ня можна завесьці добраго пладазмену, бо у папары німа як сеяць травы.

4) Пры шнуравой гаспадарцы, гдзе мала сеецца канюшыны, люцэрны, сэрадэлі, ня можна много прахаваць скаціны, а дзеля таго гаспадар мае мала гною і малы ураджай.

5) Папар ня можна гнаіць лубінам, бо на ім цэлае лета пасьвіцца есковая скаціна.

6) Ніколі ня можна дагадаваць чыстаго збожжа, бо з суседніх шнуроў будзе насевацца зельле.

7) Бараной, плугам і другімі прыладамі ня можна добра вырабіць зямлю на вузкіх шнурох, бо у поперэк нема як працаваць.

8) Гной вазіць далёка і марудна, і растрасецца шмат.

9) Парашкамі гнаіць цяжэй, бо шмат ляціць на чужое.

## Якая выгада перэйсьці на хутары.

1) Калі земля ў вадным кавалку, то менш поля прападае пад межамі і дарогамі. Напрыклад, калі 3 дзесяціны ў трох шнурох і калі лічыць межу нават чверць аршына, то на межы ідзе 225 квадратных сажэнёў (хваце гэтай зямлі на добры гарод). Калі 3 дзесяціны будуць

у вадным кавалку, на межы 28 кв. саж., і граніца пры 3 кавалках будзе 2436 саж., а пры адным—360 саж. на граніцы. Значыць, пры хутары лягчэй абкапацца канавай і плоты паставіць.

2) Парэзаўшы выганы і грамадзкіе пашы пры пераходзе на хутары, зямлі прыбавіцца столькі, што можна яе будзе дадаць і малозямельным.

3) Самае глаўнае, што на хутары можна вясьці 4-ох, ці 6-ці польную гаспадарку.

Пры гэтым засеваецца 1 поле канюшынай, або люцэрнай, або ешчэ іншымі расьлінамі. Тады столькі прыбывае корму, што жывёлы можна ў два разы болей трымаць, як пры гаспадарцы на шнурох. Калі „ёсць корм, дык ёсць і ураджай“. Канюшына так сама добра расьце пасьля зерноваго збожа, як і па цэліне. Яна сама вельмі папраўляе зямлю. На карэнях канюшыны растуць якбы маленькіе бульбачкі; вось гэтые бульбачкі сцягіваюць с паветра ў зямлю *азот*. Іон надта патрэбны для жыцьця кожнай расьліны. Дзеля таго і кладуць гной на поле, бо ў ім вельмі многа азоту. У салетры—парашку, што сыплюць на зямлю, каб быў большы ураджай, так сама многа азоту. Канюшына мае доўгіе карэньня і дзеля таго сок дастае адтуль, адкуль другая расьліна не дастае. Пасьля касьбы на канюшынішчы астаецца шмат карэнёў: якіх 600 пудоў на аднэй дзесяціне. А на 1 дзесяціне ржышча ня больш 200 пудоў. У 600 пудох карэньнёў канюшыны знаходзіцца 90 пудоў „клейкавіны“, с каторай вырабляецца салетра. Як гноіць зямлю канюшына, можна зразумець с таго, што ў 2 тысячах пуд. гною будзе толькі 65 пудоў гэтай „клейкавіны“. Гной мацней усёж такі гноіць зямлю, бо ён прэе хучэй за карэньня.

4) 1 дзесяціна канюшыны дае 200 — 300 пудоў сена, ці, значыць, столькі, колькі 3—4 дзесяціны пожні. З гэтаго выходзіць, што трэба абсушаць і касаваць сенажаці, дзе толькі можна.

5) Калі чацьвёртую часць поля займае канюшына, то выходзіць, што жыта і ярына займае меней, як 3 поля. Здалося-б, што уродзіцца яе так сама меней, але ў нас будзе больш гною, і ён будзе класьціся на меншы кавалак, так што добра угноеная земля дасць жыта болей, як пры 3 палях.

6) Як злічыло Маскоўскае земства, пры 4 польнай гаспадарцы на кожные 100 руб. агульнаго даходу прыбаўляецца 40 руб.

7) Малозямельные пры хутарнай гаспадарцы могуць каня саўсім не трымаць, а толькі наймаць яго, бо на 4-ох дзесяцінах конь мае ў год толькі 35—40 дзён

працы, а другіе 330 дней дарма есьць сена, так, што можна казаць, аднаго каня хваціць на два хутары.

8) Пры хутарнай гаспадарцы трэба завясьці розные даражэйшые прылады і машыны, што палегчаюць і палепшаюць працу чалавека. Аднаму гаспадару зрабіць гэта бывае цяжка. Дык вось чэшскіе мужыкі дзеля гэтаго робяць хаўрус: адну машыну купляе 10—20 гаспадароў і ўсе з яе карыстаюць. Так сама робяць у чэхоў хаўрусные млечарні і т. д.

Гаспадарка на хутарах будзе ісьці ў гару, а тагды і такіе хаўрусы пачнуць расьці не так, як цяпер на шнурох. калі гаспадарка стаіць на адным мейсцу.

9) На хутары гаспадарка не адбірае стольки часу, як на вярстовых шнурох; а маючы больш вольнаго часу, можна прачытаць і кнігу, і газэту, трохі розуму набрацца. Іосьць час і на тое, каб вясьці гаспадарскіе рахункі. (Без акуратных рахункоў ні адна гаспадарка ня пойдзе толкам). Маючы больш часу, можна ўсякую гаспадарскую работу зрабіць лепей, а гэта дасьць прыбытак. Можна заняцца і дамовымі рэмёсламі,—кабеты ткацтвам і др.

10) Пры хутарнай гаспадарцы выгадней развясьці сад і пчолы.

11) Шкоды на полі на хутарах павінно быць менш, дзеля таго, што жывёлу кормяць, навязываючы па канюшыне, або ў хлеві; сьвіні кормные можна трымаць у хлеві ці ў загародках, як гэта робіцца ў добрых гаспадарках.

12) Цяпер, калі, крый Божэ, адна хата спаліцца, то бывае, што і ўся вёска выгарыць. На хутары гэтакой бяды ня будзе.

13) Некаторые гаворацъ, што па аднаму страшна і нудна жыць. Але гэта так толькі здаецца, бо адзін хутарнік будзе сядзець на 4 дзесяцінах, што ляжаць як раз кругом хаты, значыцца, сусед яго ўжо будзе абок, на другіх 4 дзесяцінах. Ад аднэй хаты да другой саўсім блізка: трэба прайсьці толькі праз 2 дзесяціны. А ўжо калі будуць (а яны тады на гвалт стануць патрэбнымі) хаўрусные устройства, грамадзкая зборня, бібліотэка, крама, хаўрусная млечарня—прыйдзецца ешчэ часьцей, як цяпер, спатыкацца.

14) Кажуць, што пры разсяленьні на хутары трудна будзе са школамі: дзецям далёка будзе хадзіць. Гэта толькі так здаецца. Напрыклад, в. Пескі недалёка Кобрына Гродзен. губ., каля 40 хат, разашлася на хутары; новые сядзібы стаяць кругом вёскі. У вёсцы асталася школа і ніхто там ня жаліцца, што дзецям далёка хадзіць. З свайго двара сусед відзіць хаты сваіх

10 суседзёў. Латышы, эстонцы і др. жывуць ад веку хутарамі, а яны самые найсьвятлейшые з мужыкоў у Расеі. Ды заграніцай усе хутарамі жывуць і, як мы бачым, людзі там куды больш сьветлые за нашых.

15) Часам і ня трэба разбіваць зямлі на асобные хутары. Можна зрабіць з аднэй вёскі 3—4 засьценкі.

## Што трэба мець, каб сесьці на хутар.

*(4 дзесяціны орнай зямлі без сенажаці; выгану нема).*

З голымі рукамі і с пустой кішэняй сесьці на хутар і нарыхтаваць гаспадарку, як патрэба, ня можна. Трэба мець грошы на будоўлю, студню, насеньне і т. д.

1) Гэтак будоўля (хата, сьвіран, хлеў, глінабітные, пад адной стрэхай—185 р., гумно са сьценкамі с паплету — 64 р., студня 15 р.) на хутары „Бобоўня“ разам каштавала . . . . . . . . 264 р. — к.

2) ЗАСЕЯНА:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Жыта на | 1 | дзесяц. | 11 | пуд. |
| Авёс . . . | 2/3 | „ | 9 | „ |
| Ячмень . . | 1/3 | „ | 4 | „ |
| Бульба . . | 2/3 | „ | 100 | „ |
| Гарох . . . | 1/6 | „ | 2 | „ |
| Віка . . . | 1/6 | „ | 2 | „ |
| Канюшыны . . . . . . | | | 1 пуд. | 36 фун. |

Значыць, насеньня разам 49 р. 90 к.

3) ЖЫВІОЛА:

| | | |
|---|---|---|
| 1 Конь . . . . . . . . . | 65 | рублёў. |
| 2 Каровы . . . . . . . | 57 | „ |
| 2 Цёлкі . . . . . . . . | 60 | „ |
| 2 Кабаны . . . . . . . | 14 | „ |
| 2 Парсючкі . . . . . . | 10 | „ |
| 10 Кур . . . . . . . . . . | 3 | „ |

Жывёла разам . . . 209 рублёў.

4) Прылады да гаспадаркі:

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Панарад. . . | 15 | руб. | — | кап. |
| Сані. . . . . | 3 | „ | — | „ |
| Хамут. гужы . . | 5 | „ | — | „ |
| Набэдрыкі. . . | 1 | „ | 80 | „ |
| Дуга. . . . | 2 | „ | — | „ |
| Падседзёлак . . | 1 | „ | 80 | „ |
| Плуг. . . . | 4 | „ | 50 | „ |
| Барана . . . | 1 | „ | — | „ |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Каса . . . | — | руб. 75 | кап. |
| Серп . . . | — | „ 50 | „ |
| Вяроўкі . . . | 5 | „ — | „ |
| Сякера і інструмэнты | 5 | „ — | „ |
| Цэбры, кадкі . . | 8 | „ — | „ |
| Саганы . . . | 5 | „ — | „ |
| Дробные рэчы. . | 5 | „ — | „ |
| Уся прылада—разам | 63 | руб. 35 | кап. |

5) Грошы на абарот . . . . . 20 руб. — к.
6) Корму скаціне 100 пуд. на 20 руб. — „
7) Насеньня лубіна $16^{1}/_{2}$ пуд. на 10 руб. — „
8) Харчэй для людзей на 6 месяц.:
$49^{1}/_{4}$ птд. збожа на . . . 41 руб. 8 кап.
40 пудоў бульбы на . . . 8 руб. — „

**Значыць усё чыста разам 685 руб. 33 кап.**

Калі хто мае сваю прыладу гаспадарскую, жывёлу, корм дзьля яе і т. д., то яму, каб сесьці на хутар ў 4 дзесяціны, досі будзе 392 рублёў 98 кап. Не забудзем ешчэ гэтаго, што на хутары без вялікаго накладу акуратны пладазмен можна нарыхтаваць толькі праз 3 гады, і ўжо толькі тады будзе поўны даход.

**А. Уласоў.**

## Як аткрываць сельско-гаспадарскую суполку.

Каб аткрыць сельско-гаспадарскую суполку, трэба перш-наперш саставіць статут. Для гэтаго беруць нормальную уставу і ў кожным яе раздзеле (параграфі) робяцца тые ўстаўкі, каторых жадаюць супольнікі. Верадама, перш за ўсё трэба дастаць нормальную уставу. Такую нормальную уставу можна выпісываць з Вільні (Таварыство Коопэраціі, Вялікая Погулянка дом № 18), або з Масквы с кнігарні „Посредникъ“ (Москва, Петровскія лініи).

Калі устава ўжо зроблена, перэпісываюць яе, састаўляюць прашэньне губэрнатору і падаюць яго разам з уставай, (цяпер ужо статутом), каб зацьвярдзіў. Калі прыйдзе ад губэрнатара бумага аб зацьвярджэньні, тады сабіраецца так званае установачнае сабраньне, на каторым выбіраюць тых членоў, каторые будуць кіраваць суполкай, радзяцца, чым мае займацца суполка і другое.

Прашэньне губэрнатару пішэцца так:

**Его Превосходительству**

**Г-ну Губернатору** (названьне губэрні)

Такіх-то: імя свае і па бацькох і прозьвішчы, а так сама мейсцэ жыцьця членоў „учрэдзіцелей“ (ініціяtoроў)

## Заявленіе.

Честь имѣемъ заявить Вашему Превосходительству о нашемъ желаніи образовать подлежащее регистраціи подъ названіемъ (названьне супoлкі). для чего при семъ представляемъ слѣдующіе документы и бумаги и просимъ Ваше Превосходительство о разрѣшеніи открыть выше упомянутое общество: 1) завѣренный нашыми подписями проэктъ устава кружка въ двухъ экземплярахъ; 2) на пропечатаніе о регистраціи общества въ Сенатскихъ объявленіяхъ и Губернскихъ Вѣдомостяхъ четыре руб. 20 коп. (4 р. 20 к.).

Далей подпісы.

Законная правоспособность къ совершенію актовъ учредителей заявлена у нотаріуса.

Вось і ўсё.

# АБ СУДОХ.

Бываюць справы **гражданскіе** і **угалоўные**.

## Валасны суд.

### Гражданскіе справы у валасным судзе.

Валасному суду належаць усе справы меж мужыкамі 1) аб надзельным меньні на ўселякую сумму. (Зямля купленая праз „кресціянскі банк“, лічыцца, як і надзельная). Калі пзываюць селяне ня больш,як на 300 р. трэба падаваць у той суд, гдзе жыве атветчык, а калі справа ідзе аб нерухомай маетнасьці, то ў тую воласць, гдзе яна знайходзіцца. Валасны суд павінен прыймаць жалобы на славах, можно і на пісьме. Суд валасны дармовы.

На рэшэньне суда нездаволеная старана мае права жаліцца. Жалобы на пісьме падаюцца не пазней 30 дзён на імя паветоваго зьезду праз той жэ самы валасны суд; да жалобы трэба прыкладаць яе копію. А копію рэшэньня валаснога суда для зьезду ня трэба выбіраць, можна толькі браць для сябе, каб лепей зразумець рэшэньне. Воласць сама ўжо перэшле гэтые жалобы да земскаго начальніка, каторы іншые малые справы зацьверджае сваей уласцью, а большые перэсылае у зьезд.

---

### Угалоўные справы ў валасным судзе.

Угалоўные праступкі разьбіраюцца ў воласьці такіе: 1) каторые зроблены на зямлі надзельнай і калі праступкі зроблены мужыкамі 2) праступкі невялікіе. Калі справа непадсудна, то суд перэдае яе сам вышэйшэму. Валасны суд судзіць напрыклад: кражы да 50 р., апроч скаціны і каней, бойкі, сваркі, самоўпраўства, апроч парубок і др.

Нездаволеная старана падае жалобы у зьезд такім способам, як і гражданскіе, толькі ня трэба копіі.

---

## Земскі начальнік і гарадзкі судзя.

**Гражданскіе справы.** Земскі начальнік і судзья разбірае справы між усемі станамі. Яму падсудны справы, калі атветчык, ці нерухомасць, а якой ідзе гутарка, знаходзіцца ў яго вучастку, а гарадзкі судзья судзіць мястэчковые справы. Яны і судзяць: 1) калі пазываюць ня больш як на 300 руб. (вэкслі, страты) 2) іскі выходзячые з ўладаньня нерухомаго, нябольш як аб 500 руб. (кантракты), 3) іскі аб нарушэным уладзеньні (а захватах зямлі, калі не прайшло 6 месяцоў ад захвата). Аб прагонах, праездах судзіць ужо член акружнаго суда. Жалобы аб гражданскіх справах земскаму і гарадзкому судзям падаюцца на пісьме, або на словах. За кожны адзін рубель іску трэба ўнясьці 7 кап. (апроч іскоў да 10 руб.—гэтые дарма). За кожны ліст поданай бумагі па 10 кап. У кожным прашэньні павінно быць напісано: 1) хто пазывае, 2) каго, 3) сколькі грошы ці што, 4) якіе мае довады (дакумэнты і сьведкі) і гдзе жыве сам і усе паменёные асобы.

## Форма прашэньня аб гражданскай справе.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ

Господину Земскому Начальнику
6 участка Вилейскаго уѣзда.

Крестьянина Краильской волости дер. Пецюла Ивана Яковлева Булды.

### Прошеніе.

Мѣщанинъ Иванъ Петровичъ Чайковскій, живущій въ застѣнкѣ Шорсы Краильской волости, обязался доставить мнѣ двѣ сотни кирпича въ мой домъ въ дер. Пецюла, причемъ деньги 3 рубля получилъ впередъ и обязался роспиской доставить мнѣ хорошо выдѣланый кирпичъ на своихъ подводахъ къ 1 сентября 1909 года, но къ этому числу Чайковскій прывезъ мнѣ всего $1^1/_2$ сотни и то плохого кирпича, стоющихъ не болѣе 1 рубля, а почему и ссылаясь на свидѣтельство Андрея Павлова Рудого, видѣвшаго привезенный кирпичъ, прошу взыскать съ Чайковскаго 2 рубля въ мою пользу. Свидѣтель Рудой живетъ въ дер. Значкахъ Хотической волости.

*Булда.*

1909 Сентября 15.
Настоящее дѣло прошу разобрать въ моемъ отсутствіи *).

---

## Форма прашэньня аб вэксэлі.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ

Господину Земскому Нач льнику
5 участка Ошмянскаго уѣзда.

Прошеніе крестьянина Ивава Иванова Дулебы, Воложынской волости дер. Смоктуны.

### Прошеніе.

Прилагая при семъ вексель на 300 руб., выданный мнѣ двоpяниномъ Антономъ Ивановичемъ Лабановскимъ живущимъ въ им. Краковка Воложынской волости, прошу взыскать съ Лабановскаго означеные 300 рублей, судебныя и за веденіе дѣла издержки и наложить запрещеніе на его имѣніе „Краковка", для чего представляю квитанціи Государственнаго казначейства во внесеніи 3 р. 15 к. на кредитъ наложенія запрета и 3 р. 20 к. судебнаго и листового сбора. Настоящее дѣло прошу разобрать въ моемъ отсутствіи.

*Иванъ Ивановъ Дулеба.*

20 Января 1910 г.

---

*) Бо калі не напісаць гэтаго, то за неякай пазоўца судзья справу скасуе.

Калі рэшэньне войдзе ў законную сілу, то трэба выбраць споўніцельны ліст ад земскаго і яго прэдставіць прыставу, а ён будзе ўзысківаць, калі з добрай волі не заплацяць. Не пазней месячнаго срока нездаволеная старана можэ жаліцца ў зьезд, падаючы жалобу праз земскаго начальніка ці судзью, што судзілі тую справу. Падаваць трэба столькі копій, колькі было праціўнікоў, і так сама трэба прылажыць ліставы збор (10 к. з ліста) і па 1 кап. ад рубля той сумы, аб каторай ідзе спрэчка. Усякіе бумагі трэба падаваць праз почту, ці самому земскаму, а не праз пісароў. Каліб збору даў менш як трэба, то земскі заведоміць і дасць тэрмін, калі даслаць недастачу. Трэба добра прачытываць усякіе павесткі і бумагі, што прысылае суд: там надрукованы усе правілы.

**Угалоўные справы.** Земскаму начальніку і гарадзкому судзьі падсудны розные праступкі: 1) зробленые у іхнім вучастку, людзьмі розных станоў 2) памененные ў „Уставе о наказаніях, налагаемых міровымі судьямі", калі шкоды і страты ад праступку ня болей 300 рублёў. Калі хто прычыніць сваім угалоўным праступком якую шкоду, то можна прасіць разам і сказаць, каб вярнуць за шкоду. Пры гэтым ня трэба плаціць збороў. Ёсць справы, ў каторых заўсёды можна мірыцца; памірыўшыся, трэба прасіць судзью справу „прэкраціць". Мірыцца можна, калі: малая бойка, лаянка, парубка, самоуправство і др., а за кражу, машэнства мірыцца ня можна (апроч памеж бацькоў і дзяцей). Калі справа земскаму ці судзьі не падсудна, то яны самі перэдаюць у другі суд. Рок (срок) абжалованьня у зьезд праз таго-ж судзью 2 нядзелі.

### Форма прашэньня аб угалоўнай справе.

ЕГО ВЫСОКОРОДІЮ

Земскому Начальнику 5 участ. Виленскаго уѣзда.

Крестьянина Ивана Федорова
Рыбака, жительствующаго въ д.
Колосы, Радошковской вол.

### П р о ш е н і е.

Въ ночь на 20 сентября сего года съ моего двора украдена овца цѣною въ 3 р. Таковую овцу я опозналъ 6 октября у мѣщанина Феликса Антонова Петрашкевича, проживающаго въ гор. Радошковичахъ по Кейдановской улицѣ. Прошу подвергнуть его законной отвѣтственности и взыскать съ него въ мою пользу 3 руб. Къ разбору дѣла прошу вызвать свидѣтелей: 1) Пе-

тра Феликсова Калоду, жительствующаго въ дер. Кисеяхъ, Радошковск. вол., который видѣлъ, какъ обвиняемый выѣзжалъ изъ дер. Колосы въ ночь на 20 Сентября, везя овцу, і 2) Василія Александрова Нечельскаго, жывущаго въ дер. Сыцевичахъ Радунск. вол., бывшаго со мной при опознаніи овцы у мѣщанина Ф. А. Петрашкевича.

*Иванъ Федоровъ Рыбакъ.*

10 Октября 1909 г.

---

## Паветовы зьезд.

Атрымаўшы справу ад валаснога суда, земскаго начальніка, гарадзкога судзьі, зьезд на ўсе справы будзе вызываць павесткамі староны. Можна прасіць зьезд дапытаць сьведкоў, што не па праўдзе паказалі, пад прысягай і прывясьці новых. Калі прывязеш сьведкоў (без павестак, сам) у зьезд, то трэба 1) прасіць перад разборам справы, каб іх суд дапытаў і 2) трэба пільнавацца, каб яны ў залі суда не былі, як справа пачалася, калі іх суд не пакліча. У судзе кожны павінен гаварыць праўду, коратка і не плясьці, што не належыць да справы.

**Гражданскіе** справы зьезд рэшае аканчацельна і рэшэньне споўняецца. Напрыклад, грошы ўзысківаюць і трэба плаціць, с кватэры выкідаюць, з арэнды так сама; але калі б сам суд зрабіў вялікую абмылку, то нездаволены можэ ў 30 дзен жаліцца губэрскаму прысутству. Але гэтую (кассаціонную) жалобу зможэ напісаць толькі адвакат, просячы, каб губэрскае прысутства казало зьезду нанова разабраць справу, дый гэта рэдка бывае. Рэшэньня спраў, што прыйшлі з валасьці, зьезд перэдае для споўненьня ў валасць, а ў справах земскаго начальніка і судзьі трэба выбіраць споўніцельные лісты са зьезду самому. Калі ў зьездзе засудзяць, то лепш плаціць самому пад распіску, бо іначэй будзе ўзысківаць прыстаў, а за гэта яму прыдзецца шмат плаціць за споўненьне.

**Угалоўные справы.** У угалоўных справах рэшэньне так сама лічыцца акончацельным, але спаўняецца толькі тады, калі праз 2 тыдні нездаволеная старана не обжалуе у губэрнскае прысутства. А калі прыгавор увайшоў у законную сілу, то яго спаўняе сам суд.

* * *

Справы, каторые не падсудны валасному суду, земскаму начальніку і гарадзкому судзьі, разбірае *паветовы член суда і акружны суд.*

У валасным судзе, ў земскаго начальніка, гарадзкога судзьі і зьездзе адвакат непатрэбен, у другіх судох без адваката абыйсьціся цяжка.

# Колькі слоў аб нацыянальным адрадзэньні беларускага народу.

„ У Эгіпце ў магілах калісь-то знайшлі жменю пшэнічных зернят. Пралежалі яны там некалькі тысяч гадоў і ўсёж-такі, як іх пасеялі, зерняты ўзыйшлі і далі ураджай. Усё, ў чым толькі ёсць пачатак жыцьця, можэ ажыць, калі зложацца патрэбные варункі; гэтак бывае з народамі. Як вучыць гісторыя, не адзін ужо народ, каторы зваевалі насільствам, заціснулі безпраўем, і каторы, здавалося, саўсім памёр, — разам будзіўся, і дух народу, прачнуўшыся ад доўгаго сну, уставаў на новае жыцьцё. А, разваскросшы, кожная нацыя мае ўжо такую сілу, нацыянальнае пачуцьце робіцца такім моцным, што, ня гледзячы на ўсе прашкоды, заўсягды народ прачысьціць сабе дарогу да новаго жыцьця..."

Гэтак пішэ рускі вучоны прафэсар, А. Погодін, і яго словы маюць вялікую цэну для нас, беларусоў: мы пачынаем жыць другі раз, наново.

Вось, короткая, гісторыя таго, як мы жылі даўней і як замёрлі.

Гадоў 700—800 таму назад на зямлі, дзе цяпер скрозь чутна беларуская мова, жыло некалькі славянскіх племён: крывічы, дрэговічы, северане, вятічы і др. У XII—XIV веках памалу заваевала іх Літва. Пад ўласцю літвіноў гэтые невялікіе племена славянскіе пачалі зближацца, і скончылося тым, што яны злучыліся ў адно, ў адзін *беларускі народ*, сталі гаварыць аднэй супольнай *беларускай мовай*. А літвіны ня толькі не зрабілі ім ніякой крыўды, не заціснулі іх нацыянальны дух, характэр, а самы прынялі беларускую культуру, гасударственые парадкі, устройства жыцьця. Скора ўсе інтэлігэнтные літвіны іначэй не гаварылі меж сабою, як толькі па беларуску. Мова беларуская стала гасударственай мовай Вялікаго Княжэства Літоўскаго: па беларуску пісаліся законы, казённые дакумэнты, граматы, ўселякіе контракты і іншые бумагі. Навука была скрозь

беларуская; кніжкі—там сама. Тады былі надрукованы па беларуску Біблія, Эвангелія, розные вучоные кнігі, Статут Літоўскі (законы) і др.

Тысяча гадоў беларуская мова панавала ў Беларусі і Літве. Яна лічылася „культурнаю“, ёю гаварыла і шляхта беларуская, і паны, і князі вялікіе. Зналі пра беларусоў тады далёка за граніцамі нашаго краю, у Эўропе. Але ўжо за караля польскаго Аўгуста II (ў канцы XVII в.) ў літоўска-беларускім гасударстве, катораe ешчэ раней злучылося с Польшчаю, заместа беларушчыны пайшло панаваньне польскай мовы, вышэйшай польскай культуры. Наша інтэлігэнція памаленьку забыла сваю родную мову, пачала скрозь гаварыць па польску, далёка адсуналася ад „простаго“ народу. А той народ, што астаўся беларускім, с таго часу ня меў ужо людзей, каторые нясьлі бы яму сьвет навукі, культуры, дый ня маючы ні правоў, ні голасу, заснуў доўгім глыбокім сном.

Сто гадоў таму назад Беларусь ад Польшчы перэйшла пад ўласць Расеі. Але жыцьцё яе не зьмянілося: гаспадарка ў Беларусі асталася такая самая, як раней была. Беларусы так сама ня мелі голасу і далей спалі моцна.

Цяпер гэты сон скончыўся. Беларусы, хоць і спалі, але не забыліся, хто яны, не пакінулі ні мовы, ні звычаёў сваіх. Націанальнае жыцьцё было глыбока заховано, як пачатак жыцьця ў тых зернятах пшэнічных, што знойдзены ў тысячалетніх магілах. І як зерняты ўзыйшлі і далі ураджай, так народ беларускі васкрос і ідзе к новаму жыцьцю. „А на гэтай дарозе — кажэ праф. Погодін, — ніхто ня мае сілы затрымаць беларусоў!“

* * *

Вось, скончыліся ўжо тры гады, як нарадзілася беларуская газэта. Тры гады друкаванае беларускае слова нясе ва ўсе куты нашае старонкі думкі аб адрадзэньні забытаго ўсімі народу, паказывае беларусу, што ён такі самы *чэлавек і грамадзянін* свайго краю, як усе іншые, што мова яго і ўсё націанальнае багацьце мае вялікую цэну, дый беларускі народ, пакрыўджэны гісторыей і людзьмі, павінен заняць пачэснае мейсцэ ў сямьі братніх націй. Газэта асьветляе гэтае жыцьцё мужыка-хлебароба. і ў гэтай рабоце ёй памагаюць самі беларускіе селяне: ўсё болей павелічываецца грамада супрацоўнікоў і карэспадэнтоў газэты, і таму ў ёй, як у люстры, бачым жыцьцё краю.

Але не самае друкованае слова, не сама газэта робіць адрадзэньне 8-мі мільённаго народу, бо ёй гэта

і не пад сілу: яна толькі кіруе яго, яна раздзьмухівае тые іскры нацыянальнай сьведамасьці, што бліснулі ў часі завірухі, каторая ад краю да краю ўскалыхнула ўсё Расейскае гасударство.

Праўда, ешчэ перад гэтай завірухай бачым (бадай, праз цэлы XIX век) пробы збудзіць беларусоў: адзін за адным, з'яўляюцца беларускіе песьняры-паэты каторые сваімі вершамі і песьнямі кідалі зерняты любві да бацькоўшчыны, да ўсяго, што сваё роднае. Але ў той век цемнаты і паняверкі народу беларускаго (ешчэ за паншчыну) гэтые зерняты не даходзілі да нашай вёскі, а калі і даходзілі, то падалі на неураджайную глебу і ня ўсходзілі. Мы ня будзем пералічываць першых твораў у беларускай мове, каторые з'яўляліся ў прошлым сталецьці: яны паказаны ў бібліографіі. Скажэм толькі, што найшчаслівейшымі с-памеж паэтоў таго часу былі Богушевіч (Мацей Бурачок) і Янка Лучына (Неслухоўскі): іх творы друкаваліся ў 90-тых гадох XIX в. і пайшлі глыбока ў народ, але і то толькі тады, як у Беларусі з'явіліся *нацыональные організацыі*

Гэтые організацыі нарадзіліся на межы XIX і XX сталецьцёў — спачатку ў Мінску, Вільні і іншых гарадох нашаго краю,, пазьней у Пецербурзе, Рызе. Невялікіе грамадкі школьнай моладзі студэнтоў, дый сталых людзей пачалі дружна шырыць меж беларусамі сьвет навукі ў іх роднай мове. Але пры тадышніх варунках жыцьця чыста культурная праца гэтых організацый мела вельмі многа перашкод і таварыства пашырэньня прасьветы не шмат здалелі зрабіць.

Аднэй з прычын упадку першых культурно-нацыональных беларускіх організацый было і тое, што рэволюційная завіруха захапіла ўсю нашу моладзь. Усе інтэлігэнтные сілы краю занялiся аднэй толькі палітыкай. Тады залажыліся першые беларускіе палітычные організацыі—парціі.

Аб тым, што рабілося ў Расейскіх губэрнях і па вялікшых гарадох, беларускі мужык чуў толькі неясные весткі. Не разумеючы добра, чаму і аткуль пайшла тамака завіруха, наш селянін пачаў разглядацца навакол, пачаў думаць аб сваім жыцьці і долі сваёй, аб прычынах усяго злога, аб сваім палажэньні меж іншымі станамі і народамі. Гэтые думкі, каторые і разбіраліся і ў друкованым, і ў жывым беларускім слові, давялі нашаго хлебароба да пазнаньня таго, што ён такі-ж чэлавек, як усе, дый у такім прыпадку і ўсё яго роднае, як мова, думкі, песьні, звычаі і т. д.. ня горшые за чужаземные. Раз пазнаўшы гэта, беларус падняў свой го-

кас, дамагаючыся сабе грамадзянскіх правоў; жадаючы шацунку дая сваей мовы і дапушчэньня роднаго слова ў школу. Да гэтаго жаданьня прылучылася вялікая частка народнай інтэлігэнціі—вучыцелёў народных.

Тады—ў 1906 гаду—аткрылася першая выдаўніцкая суполка „Загляне сонцэ і ў нашэ ваконцэ“ ў Пецербурзе; яна надрукавала першые кніжкі да навукі па беларуску (лемэнтар, першае чытаньне і іншые), а так сама пачала выдаваць творы песьняроў нашых даўнеўшых і новых. У канцы 1906 году ў Вільні выйшла ў сьвет і першая беларуская газэта „Наша Доля“: народ жадаў, каб яму асьветлялі ўсё тое новае жыцьцё, катораго ён не разумеў, і таму газэта адразу знайшла многа тысячоў чытацелёў меж селянамі. Але „Наша Доля“, пажыла недоўга. Ешчэ перад смерцю яе ў Вільні аткрылася новая беларуская газэта „Наша Ніва“, каторая на першым мейсцы паставіла культурно-нацыональную работу, якую вядзе і цяпер.

Праз тры гады жыцьця беларуская газэта пасьпела, ўсё-ж такі зрабіць немала.—„Наша Ніва“ выклікала грамаду супрацоўнікоў-селян і гэтак зрабілася народным дзелом—народнай ўласнасцю. На яе клік пааткрываліся новые беларускіе культурно-нацыональные організацыі—суполкі „Мінчук“, „Наша Хата“ і т. п., ды ўсе яны шчыра працуюць, каб узбагаціць родную літэратуру і даць беларусам можнасць вучыцца з кніжак, пісаных мовай бацькоў іх. Пры „Нашай Ніве“ ўзрасла і расьце чэрэда нашых песьняроў-паэтоў і пісацелёў, каторые выйшлі с курнай мужыцкай хаты і ў пекным слове малююць душу нашаго народу, малююць яго жыцьцё, яго долю-нядолю, яго звычаі, думкі, жаданьня.

*Янук Купала.*

# ПЕСЬНЯ ЗВАНАРА.

**(В. і М. Ластоўскім)**

На высокай гарэ, дзе ніхто не арэ,
Толькі птушка-арол дзе садзіцца,
Там збудую, ўзвяду нізі ўсёй на віду
Мураваную вежу званіцу.

І завешу я звон, с усіх чутны старон—
Раўня голас і віхру, і грому.
Як пушчу яго ў ход, сазаву харавод,
Ні адзін не заседзіцца дома!

Разгудзіцца мой звон ад вакон да вакон,
Душы збудзіць, па сэрцах ударэ,
Дрогнуць сковы цямніц, бліснуць іскры зарніц,
Заварушацца яры—папары.

На мой кліч вечэвы хто жывы, чуць жывы,
Пад гарою касой загамоне.
Гулом звона скажу, сьцежку-шлях пакажу
На прывольле, на ўродные гоні!

За гарой, за другой дам жывы вадапой,
Жыватворнае кожнаму зельле.
На нязлічэны час па нягодах папас,
Тым ўсім, што цярпяць і цярпелі.

Гэткі будзе мой клік—і магуч і вялік,
А не трапіць ён к душам прыспаным,
Вызву гром, пяруны—хай памогуць яны
Раз'агніць, затрасьці ўсе паляны.

Стогне бура; грымот. Я свой звон, ход у ход,
Размахну, як ніхто і ніколі.
Аж ад рук і ад хмур вежы рухне падмур,
Толькі розгалас пойдзе па полі.

Ляжэ крушнею там вежа, звон і я сам.
Арол-птушка ўскрыліцца пад небом.
А навокал гары задымяць сьцежары,
Груганамі ўскалышацца вербы...

. . . . . . . . . . . . . . .

І весна, і зіма. Быў званар і нема.
Ціха, ціха на белым прасторы.
Толькі жыў не жывы звону гул вечэвы,
Аб тым шэпчуць дубы, ясакоры.

Ідзе, сходзіць лет шмат. Званара помніць брат,
Помніць звон, а сястрыца званіцу.
Аб высокай гарэ, дзе ніхто не арэ,
Казкі-байкі ліюцца крыніцай.

Як у прошчу па лек, стане йсьці чэлавек
К мохам высланай крушні каменьня,—
Ад звана чэрапок, цэглы—мура кусок
Будуць несьці падмогу ў цярпеньню.

Буду ўсё званаром, хоць даўно пад дзерном
Сьпіць мая галава маладая.
Эх, бо ведае сьвет, што вялікіх дум цвет
Адно толькі на зломе ўзрастае.

*Мацей Крапіўка (Ц—ка).*

# ГРАЙКА.

Граў бы я многа, дый сіл не хватае
І рвецца за стрункаю струнка,
Хоць песьня ешчэ не замёрла ўдалая
Хоць родзіцца думка за думкай.

Граў бы я многа, ды сьмерць кажэ „годзе!“
У магілку мне ладзіцца кажэ...
Эй, рвіцеся струны, што гэта мне шкодзе?
У магілку супольна мы ляжэм!

Можэ с тэй ліры вырасьце іва,
С парваных струн—белые кветкі;
Можэ вясною будуць ігрыва
У дрэўпа ценю гуляць дзеткі;

Можэ хто з дзетак скруце жалейку,
Ўнучку паломанай ліры,
І так заіграе, што ўсенька зямелька
Пачуе мой одгалас шчыры!

Дзедавы струны, рана парваные,
Зноў громка азвуцца, як звоны,
Песьня, за жыцьця яго недаграная,
У сэрцы ўнука дасць плёны.

А на задушкі пад цёмнаю івай
Жывое пачуецца слова,
Што песьня ўстала с стотысячнай сілай,
Жыве мая ліра нанова!

## ВЕСКОВЫМ КАБЕТАМ.

Ой, сястронкі, ой весковы,
Ой, вы кветкі прызавяты!
Вашы твары, як васковы,
Вашы шчокі слязьмі змяты...

Як каліну град страсае,
Як пярун каменьне крышыць,
Так лёс рана вас ламае,
Так жыцьцё красу вам нішчыць.

Колькі болю ў вачах хмурных,
Колькі скаргі з губ збялелых,
Колькі срэбра ў косах густых,
Колькі поту з рук абмлелых...

А за гэта вам дзьве дошкі
І крыж з хвоек ледзьве збіты,
І у памяць плачуць дочкі,
Бо-й яны, як вы, забіты.

Ой, кабеты, ой, вясковы,
Ой, вы кветкі прызавяты!
Ой, ліленкі вы без мовы,
Ой, вы птушкі безскрыдлаты!...

*Якуб Колас.*

## Нёман.

Льецца Нёман памеж гораў,
Сьветлы, чысты, як раса.
Накапаў ён ям і нораў,
Гоніць воду праз леса.
Гой, ты, Нёман, наша рэка!
Поіш ты і корміш нас,
Бедну чайку чэлавека
Ты с сабой насіў не раз.
А вясною на прасторы
Дуб стары сярдзіта гнаў
І насіў ты крыгаў горы,
Луг і поле затапляў.
Разліваўся па ракітам,
Занімаў і лес, і гай...
Доўговязы плыт за плытом
Носіш ты ў далёкі край.
Колькі раз рыбацкі човен
Па грудзёх тваіх гуляў!..
Гой, ты, Нёман, быстры Нёман!
Колькі дум ты мне нагнаў!
Чуў ты смутак горкай долі
Свайго сына мужыка,
Чуў не раз у пустым полі
Плач і слёзы бедака...
Ў ціхі вечэр над табою
Дудка плакала ня раз,
І каціласе слязою
Песьня ў цёплы летні час...
А на берэзі, пад дубом,
Ў ночку цёмную рыбак
Спаў ня раз пад мокрым лубом,
Гнуўся с холаду бедак.
А у буру вецер кветку
Да грудзёў тваіх схіляў,
І ў табе касец у летку
Пот крывавы абмываў.
Над табою месяц круглы
Ў ясным небі ціха плыў,
І с табой высокі, смуглы
Лес ціхутка гаварыў.
Перарэзаў край ты родны
Беларуса — мужыка...
О, наш чысты, наш свабодны
Нёман быстрая рэка.

Ты цячэш далёка, знаю,—
Ў землю Літвы і Немцоў.
Раскажыж чужому краю
Пра жыцьцё тваіх сыноў.

*К, Каганец.*

## МАЛІТВА.

О Божэ, Спасе наш,
Ты міласць нам пакаж,
З нядолі вызваль нас,
Збудзі Ты нас ўжо раз.

Ты вочы нам аткрый
І сьвету нам пашлій,
Ты праўду нам пакаж,
О, Божэ, Спасе наш!

*Максім Богдановіч.*

* *
*

Дождж у полі і холад... Імгла...
Дзесь у вёсцэ міргаюць агні.
Там злякаўшысь схавалась, лягла
Доля горкая ў чорным цені.

І пад цёмнымі скрыдламі ночы
Не убачаць цяпер яе вочы.

Толькі вецер асеньні, начны
Ў полі сумна гудзіць і пяе
Аб радзімай старонцэ глухой
Ды аб долі нешчаснай яе.

Цісьне сэрцэ мне песьня начная...
Хай жэ голасно вецер сьпевае,

Хай пяе ён у роднай зямлі,
Каб у сэрцах нам сорам збудзіць,
Каб змагацца з непраўдай ішлі,
у чыім сэрцы суменьне ня сьпіць.

Долю чорную ноч не схавае,
Калі выльецца песьня жывая!

*Альбэрт Паўловіч.*

## ПЯСТУН.

Ля стала стаяла маці,
Цешыла дзіцятка.
Сын разроўся без прычыны,—
Рады не дасць матка.
І так і сяк яго песьціць,
Гадае, што трэба:
Можэ сыру, млечка, масла,
Мо да грыбкоў хлеба?
Годзі плакаць, мой сыночку,
Успакойся крышку.
Саўка злуе—бразь аб землю
І грыбкі і лыжку.
— Ну чаго ж ты? што с табою?
Штож так зазлаваўся?
Можэ хворы? маці кажэ
— Бач, як змардаваўся.
Саўка стаў цішэць патроху,
Цэдзіць ён праз губы:
— Грыб няжованы пабег зноў,
Не ўлаваў на зубы.

*Стары Улас.*

*
* *

Прамчаўся май і веснавая
Пара мінулася у нас,
Ужо і лето наступае,—
Гарачы наступае час.
Весна, весна—дзенькі любые—
Так дарагі, так мілы час.
Чаму, як леты маладые,
Так скора пакідаеш нас?!
Ты прыбірала ў зелень мая
Зямлю, дзерэўцы і кусты,—
Хоць прыйдзе некалі другая,—
Але ня будзеш гэта ты!
Нам жаль тваіх дзенькоў пагодных;
Ціхіх і цёплых вечароў
Так сэрцу дарагіх і родных,
І гэты час як сон прайшоў...
Гэтак і моладасць нясецца—
Жыцьця людзкого гэты квет,
І толькі памяць астаецца
Гэтых вясёлых—бурных лет!

*З. Будзько*

## ВОСЕНЬ.

Вось і даждалі...
Дні скараталі;
Сонцэ апало;
Захаладняло;
На дварэ дурна—
Ветрэна, хмурна.
Лісьця пажоўклі,
Паападалі,
Птушкі замоўклі,
Павылеталі...
Пуста і нудна...
Звыкнуцца трудна!..

*Э. Буйло.*

## ЛЕС.

Ой ты, лес зелёны,
Чаго ж ты шуміш?
Ці жыць табе трудна?
Чаму ня маўчыш?
Ці думка якая
Ўсё цябе гневіць?
Ці якая пошэсць
Над табой вісіць?
Не! то і ня пошэсць,
Не безвольле дум,—
Бура мне наводзіць
Гэты страшны шум.
Мяне страшыць бура,
Што ідзе здалёк
Ды верхі сасонак
Сьцеле ўпаперок?

*М. Арол.*

## ПЕСЬНЯ.

Каб была я птушкай,
Птушкай быстракрылай,
Да цябе стралою
Паляцела б мілы.
Але Бог ня даў мне
Крыльляў птушкі лёгкай

І адна жыву я
Ў чужыне далёкай.
Толькі як засну я,
То ў сьне цябе бачу;
Але як устану,
Дык горка заплачу.
Толькі ў сьне разлукі
Не знаю с табою,
Да цябе на грудзі
ɞ паўшы сіратою.
Ах, каб мог сон гэты
Вечна не мінацца,
Каб магла хоць ў марах
На цябе ўглядацца!..

*В. Каршун.*

## З ПЕСЕНЬ АДЗІНОКАГО.

І нудна, і цяжка на сэрцы,
Прывету нідзе ня відаць.
Здаецца б, не страшна і ўмерці,
Благое жыцьцё скаратаць.
Як вецер мятлічку хістае,
Як лес непягодай шуміць,
Так смутак душу мне з'едае,
Так сэрцэ без сэрца баліць.
Зірну я на яснае небо,
Зірну на сяло пад гарой,
Я чую „Цябе нам ня трэба—
Ты будзеш век жыць сіратой“.

# АБРАЗКІ.

*(Афяруецца Якубу Коласу).*

Я чуў, як мой брат-беларус сьпеваў свае песьні.

Божэ! Колькі мукі і енкоў у ягоным голасе, колькі скаргі страшнай у гэтай песьні, што выходзіла з яго грудзей і смутна і нудна лілася па полі, аддавалася гулка ў лесе і падымалася выжэй і выжэй—аж да сіняго, спакойнаго неба!

За сэрцэ хапала гэтая песьня—песьня мужыка-нявольніка.

Загудзелі ў душы ўсе струны, з грудзей вырваўся енк і на вачах закруціліся сьлёзы...

Бедны, бяздольны народ; сьлязмі і потам залітая зямелька.

* *
*

Вот вёска, дзе жывуць мае браты.

Дрэнненькіе хацёнкі прыляпіліся адна да аднэй; абапол стаяць хлевы і паветкі; дзе-ня-дзе угледзіш садок. Толькі рабіна, што плачэ чырвонымі сьлязмі, ды кудравая бяроза, ды хвойка век-вечны глядзяць на тваю, бяларус, нядолю...

Як смутна!..

А кругом раскінулася шырокае поле. Як мурашкі, высыпаліся туды мужычкі і, сагнуўшыся над цяжкімі сахамі, аруць усохшую зямельку. Тут ўся іх надзея, ўсё іх багацьце, усё іх шчасьце...

* *
*

Ў беднай, курнай хатцы, на канцы вёскі, гарыць лучына, уткнёная ў сьцяну. На скрыпучай жэрдцы вісіць калыска, а ў ёй ляжыць галоднае дзіцятка. Над ім, сагнуўшыся, стаіць мацi і пяе песьню—нудную, смутную песьню; а ў тэй песьні столькі енкоў, столькі нявыплаканых сльёзаў, што самому хочэцца разам з ёю плакаць і крычаць на ў весь сьвет: „Ратунку! Падмогі!..“

А там, у куце, на лаві варушыцца нешто пад кажухом. Гэта хворы мужык-гаспадар хочэ падняцца, каб напіцца вады—і ня можэ. Яго кінулі сілы: цяжкая непамерная праца падтачыла яго здароўе, і вось ён ляжыць, бедак, звесіўшы мазалістую руку, і спекшыміся губамі шэпчэ: „Піць“, а пасьля доўга—доўга кашляе... Відаць, што ўжо апошніе свае дні дажывае мужык. Гэта канец гаротного жыцьця...

* *
*

Вот магільнік, гдзе лежаць косьці нашых дзедоў і бацькоў.

Некалькі хвоек, ліп і бярозак, с поўсотні згніўшых крыжоў—і ўсё...

Як ціха, як смутна.

Нішто не нарушае вечнаго сну нябошчыкоў,—іх адпачынку па цяжкім, бяздолным жыцьцю. Толькі часом закрычыць сава, што зьвіла сабе тут гняздо ў дупле старай ліпы, закаркае варона, закукуе-загалосіць зязюлька над мужыцкай нядолей. Заўтуруюць ёй сваім шумом хвойкі і бярозы—і ізноў ўсё сціхне, засьне...

* *
*

Вось ты які, мой родны край!

Смутак вее ад тваіх вёсак, ад палёў тваіх і лясоў, ад рэк і вазёраў і ад тых крыжоў, што стаяць пры дарогах. Смутак чуваць у тваіх песьнях—скаргах, мужык беларускі; смутак і надзея ў тваіх малітвах, што да Бога шлеш.

Смутак і скарга...

Люблю цябе, мая родная старонка, мая матка—Беларусь! Ты выгадавала, мяне, ты мне паказала нядолю і слёзы маіх братоў.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Віджу—ўсходзяць над табой зоркі ясные, усё сьвятлей робіцца ў табе...

Веру—ўстане сонцэ, пашле яно нам свой сьвет, разгоніць туман, што спавіў цябе, Беларусь!

Прыйдуць для цябе лепшые часы...

Для сыноў тваіх зачнецца новае жыцьцё—вольнае, сьветлае! Стануць яны ўрад са старэйшымі сваімі братамі і дружна возьмуцца да агульнай працы, а ты, маці, падымеш спаневераную дагэтуль галаву і сьмела будзеш паглядаць у ясную будучыну, што нясе тваім дзецям лепшую долю, лепшую славу!

**Пётра Просты.**

# СУД.

Эх, братцы, кепска стало жыць на сьвеце, калі ўжо за курыцы сусед суседу анэгдысь калом галаву пашчэпіў, ды пасьля за гэтую самую курыцу (ведама, спусціўшы адзін другому юху) будуць цягацца па сьледавэцелёх, ды па судох. А што за шкоду зрабіла курыца? От вырвала на гародзе бурачкоў на пядзі тры. А ім, гэтым задзіркам, колькі гэта курыца будзе каштаваць? Цэлаго падцёлка, калі ня больш! Німа цяпер памеж маладых дабра.

А вось паслухайце вы, якіе ў нас даўней былі суды. Нябошчык Янка (вечны пакой яго душы), „махляром“ што звалі, забраў са свайго аўса двох быкоў Рыгора Канцавога: праўда, аўса зьесьці—мала зьелі, але шмат стратавалі; дома пагадзіцца—не пагадзіліся, напісаў пахтар прашэньне і пайшло ў суд.

Цешыўся і я з гэтаго, бо ўжо колькі часу, як і на маіх шнурох пасьля ночы атава была стратована — не

іначэй, як гэта работа Рыгоравых Лысаго і Падласаго! Але, не злавіўшы за руку, не кажы, што злодзей. Шмат было гутаркі аб гэтых быкох у вёсцы, толькі мне Сталючонак падшапнуў, што, як у ночы хадзіў на рунь пільнаваць зайца, бачыў на маей атаве кабылу ўдавы Габрэліхі. Эгэ, думаю сабе, недачэканьне: злаўлю і я.

Павячэраўшы, зараз абуў лапці, насунуў кажух, ды ціхэнька шусць праз сенцы на гумнішчэ, гоцнуў праз плот, ды борздзенька на межу і бух!.. Ляжу... чэкаю...

Толькі першые пеўні прапеялі, як чую: едзе нехта на маю атаўку. Мусіць і аднэй малітвы не пасьпеў бы чэлавек прагаварыць, ходзіць ужо Габрэліхі кабылка па маей атаве і хрумшчыць, аж пена ідзе, а за аброць трымае ды водзіць сама Габрэліха. Здуру пагарачыўся я і, не пачэкаўшы, каб бліжэй межы падыйшлі яны, крыкнуў, скокнуў да кабылы. Але і Габрэліха, каб яе паралюш, спрытная была кабеціна: як бач, на кабылу ды ў скочку наўцекі. Гнаўся я, гнаўся, але па ночы куды там!.. Назаўтра, чуць сьвет, узяў я старасту, двох панятых, і сьледам як раз давялі. Прызналася і Габрэліха, але заплаціць за шкоду не хацела. Падаў я на суд.

Праз якіх два тыдні прыходзяць нам павесткі: і Рыгору з Янкай, і мне з Габрэліхай—усім на адзін дзень. Паехалі. Міравы судзя быў у нашым вучастку немец, і надта цяжка было з ім разгаварыцца: мала нашай гутаркі ён разумеў, а мы яго ешчэ менш.

Выклікае на сам перэд Янку з Рыгорам і пытае:

— Ну, как біль?

— Не,—кажуць,—Вашэ Скородзе, Далі Бог, мы не біліся...

— Балван,—закрычаў судзя,—я спрашываю, какой патрава?

— Не,—кажэ Янка,—не па траве, а па аўсе, Вашэ Скародзе. хадзіліРыгоравы быкі.

— Какой бік?

— Лысы і падлысы. Вашэ скародзе.

— Больван, мошэнік!—ешчэ горш закрычаў судзя—в прошэні кафаріт воль, а теперь—бік! Сам не знаеш, хто імел потрава! Ідіте дамой! мне время нет! дело кончено!

Выйшлі Рыгор з Янкай, а я стаю і дрыжу: не іначэй, як пахтар наплутаў у прашэньні і замест быкоў упісаў валоў. Ах, каб яго ліха! А калі і ў маім прашэньні зьмяніў ды замест кабылы напісаў каня? Стаю, дрыжу і языка ў губе забыўся. Стаю, шэпчу, каб ня збіцца с панталыку: „кабыла, кабыла, кабы...“ А тут

як раз клічэ мяне з Габрэліхай! Выйшоў я... стаю..... дрыжаць калены (першы раз на суд папаў). Бачу—і Габрэліха зьбялеўшы стаіць. „Кабыла, кабыла, кабы..." шэпчу я, аж тут трах! Міравы і пытае:

— Ну, как?

— Кабыла,—кажу,—Вашэ Скародзе.

— Как кабыла, кто?

—Габрэліха, Вашэ Скородзе.

Але ўжо ані вочы мае ня бачаць, ані вушы ня чуюць... стаю... дрыжу... як праз туман бачу — судзя сьмяецца, дый зноў пытае:

— Кто кабыла? кто?

— Удава, Габрэліха, Вашэ Скародзе! Але ў вачох неяк весялей мне робіцца; мусіць справу выйграю, бо судзя замест гневу сьмяецца, ды ізноў да нас:

— Ну вот і карашо: ты, кажэ, хоць і мужчына, но маленькі, а она хоть і баба, но, правда, большая кабыла. Так вы лучше так... без суда. Зачем суд? помертесь!

Глянуў я на Габрэліху, зірнула яна на мяне. Стаім, чэкаем, што будзе.

— Но, ідіте,—кажэ,—в коррідор—помертесь! На то соседі—зачем суд?

Выйшлі мы ў калідор. Глянуў я на Габрэліху дый думаю сабе:

— Кепска будзе. Хоць віна і яе, але як прыйдзецца да меры, дык рады не дам—баба рослая!

Сталі мы гэтак бокам. Узняўся я на цыпачкі, і так на корх не хватае. Габрэліха, каб ёй дна не было, дагледзела гэтую штуку, дый кажэ:

— Не, суседзе, гэта ня мера. Калі судзя сказалі памерыцца, дык трэба памерацца, як мае быць. Судзя лепш ведае, што і як трэба да справы. Давай, плечыма станем.

Як сталі плечыма, а баба ешчэ ўчапілася за маю браверку, ды цісьне ў ніз, каб на цыпачкі не ўзняўся,— дык куды там! Бадай не на ўсю галаву ніжэй я росту. Уздыхнуў я, але штож зробіш—воля Божа! Вярнуліся ў камеру, а тут судзя і пытае:

— Ну, как?

— Памерыліся,—кажэм,—Вашэ Скародзе!

— Вот і хорошо! Ідіте,—кажэ,—с Богом домой, дело кончэно, я ошэнь рад!

Выйшлі мы. Толькі... але што там валаводзіць? Хочэце ведаць, які канец? Думаеце, што зараз, як цяпер вы, маладые, зараз у зьезд, у палату, у Пецербург? Ані думаць! Да Бэркі трапілі і Рыгор з Янкай, і я з Габрэліхай. Што і як там было?... ат, было, як было, але с таго часу ня ездзілі на суд.

**Ядвігін Ш.**

# Іосць боль...

„Іосць боль цяжкаго гора, боль голаду бывае, хваробы... мяне не спаткала хвароба, ані дакучае голад, а толькі смутак чэрвем душу точыць;—і журба за нечым недасьціглым, далёкім—годным душы чэлавека...

„Вось жыцьцё шэрае перэда мной і за мной сыбірным полем—тайгай сьцелецца. З грудзей набалеўшых вырываецца ногды уздох, але безнадзейны, але глухі, як енк зямелькі-маткі пад нагамі паступаючаго войска...

„Шчасьлівы той чэлавек, каторы можэ, глянуўшы за сябе назад, убачыць праторэную ім пуціну, а ешчэ больш счаслівы той, хто ў схілку дней жыцьця свайго, падобна працавітаму сеўцу, можэ, глянуўшы за сябе, ўбачыць зялёнае поле ў пакрасе і чэкаць заплаты за мазалі і пот свой!.. Шчасьлівы і той, на пуціне катораго чырвонай жычкай значыцца сьлед вялікаго болю,—і ён, глянуўшы за сябе, знойдзе чым ажывіці самлеўшы дух.

„Мінулы вялікі боль родзіць пэрлы, але шэрая безнадзейная жуда забівае духа і, як агонь, усё зніштажае дый пакідае за сабой толькі попел, шэры попел“...

Так жаліўся сівы старэц, гладзючы дрыжачэй рукой галоўку дзіцяці. Захадячае сонцэ залаціло сівые валасы і белую бараду старца, зліваючы ў вадзін тон з ясным ленком галоўкі дзецячай. Вочы старца блудзілі негдзе ў няведамай далі, а думкі, як разбітае стада белых птушэк, кружылі паасобку. Негдзе далёка, далёка плакалі скрыпчыны струны; буйные сьлёзы, як ранняя раса на травіцы, дрыжэлі і сыпаліся з ёмкіх струн шнурамі пэрлоў белых.

Хворы, нямоцны дух старца ламаўся пад цежарам болю. Сціхна стаялі дрэвы... Усё замёрла... Здавалося, уся натура ў гэты ціхі летні вечэр чула крыўду жыцьця...

**Власт.**

---

# На усходзе сонца.

(Ахвярую „Нашай Ніве“ і усім яе супрацоўнікам).

... Мне ня спалося. Прачнуўся пасярод ночы, падыйшоў к вакну, ўталопіўся ў яго і пільна пачаў глядзець на вуліцу.

На дварэ стаяла, пекная, чароўная ноч! Неба цемнавата-сіняе, глыбокае бяз меры, доўгае і шырокае без канца, густа натыканае мігатлівымі, яснымі зоркамі, як вялізны дарагі купол, аблегало круг-кругом чорную грэшную зямлю. Зоркі весела мігацелі. Кожная з іх дадзена асобнаму чэлавеку і сьвеціць датуль, пакуль той ня зыйдзе з гэтаго сьвету. Тады зорка падае на зямлю і ліе па дарозе свае жалясьлівые агневые сьлёзы, каторые на момэнт якбы застываюць на небе, а пасьля раптам прападаюць...

Памёр чэлавек,—значыцца, патухла і зорка яго!

Гэтак кажуць цёмные людзі, ў гэта некалісь верыў і я...

Эх, колькі гэтых зорак тухне на нашых вачах, брацьця маі!.. Зоркі шчасьлівых і нешчасьлівых, зоркі багатых і бедных, зоркі паноў і мужыкоў!!.

І я ў гэту цёмную, душную ночку пачаў шчыра, не мігаючы вачыма, пільнаваць, сачыць за кожнаю зоркаю, ці не спадзе адна з іх на маіх вачах?

Сон саўсім пакінуў мяне.

І вось — там далёка, на ўсходнім краю неба, як прыхма якая, раптам адарваліся тры зоркі і мігам апалі на зямлю!—Чые яны? Ці беднаго мужыка-працоўніка, ці пана вельможнаго? Ці сіроткі гаротнаго, ці пястуна шчасьліваго? Ня ведаю! Толькі ўсё-ж такі нейчые яны ды ёсць!..—Можэ гэта на маю карысць абарвалося жыцьцё тром чэлавекам?!

Пры гэтай думцэ я хацеў апусьціць вочы, калі ізноў мне прыйшлося быць сьведкай спаданьня двух зорак... Тады я раптам, не па сваей волі, апусьціў ня толькі вочы, а і галаву і пачаў разглядаці шэрую, нудную, акрытую цьмою зямліцу, сьцены і стрэхі цёмных, нізенькіх, падобных адна да аднэй мужыцкіх хацін. У галаву палезлі думкі, каторые на вуха шэпталі мне: „На што табе гэтае неба? Што табе яго пекнасць дзіўная, яго хараство сьвятое?!—Ты—сын зямлі, нуднай, чорнай зямлі; ты—нявольнік жыцьця, цяжкого, горкаго, паднневольнаго; ты—афяра беды, нешчасьця і нядолі!.. Не на тое ты радзіўся, каб дзівавацца хараством прыроды, пазнаваць яе, а пасьля ў кніжках чыркаць аб ёй, каб і твае брацьця вучыліся любіць яе!... Ты—дзіця люду цёмнаго, забітаго, спрацаванаго, дзеля катораго нема нічога другога, апроч працы цяжкай, нязможнай, якую ён сам апевае ў песьні нуднай, зложэнай яго балячым сэрцэм, яго клапатлівым мозгам і напісаную чыстаю памяцьцю на шэра-чорных лістох часу, каторы бяжыць без канца... Усё, што жыве на сьвеце, што яго цікуе, ён знойдзе на гэтых лістох, прачытае.. і найме... Гэта

яму знаёма—другога, інакшаго пісьма, пакуль што, ён няўмее чытаць Яму найперш трэба таго, што датыкалося бы яго вушэй, вачэй, яго ўсяе істоты, што ускалыхнуло бы ім, збудзіло ад вековаго сну, расплюшчыло яму вочы; тады ён падыме іх к небу!.. Тады з яго сямьі выйдуць свае родные песьняры, каторые ў роднай мове апеюць усе дзівы сьвету, другім народам даўно вядомые"...

Пад іх цежарам я асунуўся, прысеў на лаве ля вакна і задрэмаў...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

...Колькі часу, я спаў? Што я сьніў? Ня ведаю! Толькі, як ізноў падняў галаву,—ўжо сьвежую, вольную ад цяжкіх думак,—і кінуў вокам на двор,—дык над зямлёй ужо сьвяціло сонейко.

І чым далей, тым болей і болей думкі апутывалі мяне, ўсё шчыльней налазілі ўсё новые і новые, ды ўсё заядлейшые, цяжэйшые: рабілі з мяне бязвольнаго іх слугу...

Гэтым разам узыйшло яно надта дзіўнае і чароўнае!

Сьмела і хутка выйшло сонейко з-за лесу і пamаленьку пачэсьне прыгалубіло прачнуўшуюся зямлю і ўсё жывое на ёй.

Усё весялей затрэпеталося, заварушылося і звонка засьпевало ў вадзін голас шчырую літанію ўзышоўшаму сонейку:

„Вітаем цябе, цар сьвету, цар усяго жыцьця на зямлі! Вялікае і слаўнае сонцэ! Ты прыйшло да нас, разбудзіло нас ад сну! Мы ўсталі на твой прыход і дружне, хутка пойдзем да працы! Ня сходзь жэ на векі ты з гэтаго неба—і агнём шчасьця асьвечай грэшную халодную зямлю! Вітаем цябе, сонцэ!.."

Нейкая радасць і лёгкасць напоўніла маё серцэ, і, абярнуўшы вочы на ўсход, засьпеваў і я разам з усім жывым сьвятую, дзіўную, шчырую песьню ўзышоўшаму сонцу!..

**Цішка Гартны.**




**Скорыны Апостол.**

# Беларуская бібліографія

## Беларускіе кнігі XVI сталецьця.

**Бівлия руска выложена докторомъ францискомъ скориною из славнаго града полоцька, богу ко чти и людем посполитымъ къ доброму научению.** (Прага Чэская 1517—1519).

**Псалтыръ** Ф. Скорины. (Прага Чэская 1517).

**Книга дѣянія и посланія апостольская зовемая** апостол. Ф. Скорины Вильно 1525 въ домѣ бургомистра Якуба Бабіча.

**Малая подорожная книжица** (Псалтыр, Часословецъ, Акаѳисты, Каноны, Шестодневецъ, святцы краткіе и Пасхалія) Ф. Скорины. Вильно 1525.

**Катихисісъ то есть наука стародавная хрістіанская отъ светого писма для простыхъ людей языка руского въ пытаніахъ и отказѣх собрана.** Несвижъ 1562 накладомъ Матѳіа Кавечинскаго, Симона Буднаго і Лаврентіа Крышковскаго. (Гэты катахізм—кальвінскі).

**Оправданне грѣшнаго человѣка предъ Богомъ.** Несвижъ 1562 накладом Матѳіа Кавечинскаго, Симона Буднаго и Лаврентіа Крышковскаго.

**Книга зовомая евангеліе учительное отъ всѣх четырехъ евангелистовъ избранна... и выдана есть во отчизном имѣнію пана григорія ходкевича въ мѣсте зовомомъ заблудовью властным накладомъ его милости.** 1568—1569.

**Псалтыръ** съ часословцемъ. (Друкавана ў Заблудове) Иваномъ Ѳеодоровичемъ Москвитиномъ накладомъ пана Григорія Ходкевіча 1569—1570.

**Апостолъ** (Дѣянія и посланія Апостольскія). Друковано у Львове 1573—1574.

**Евангеліе.** (Четвероблаговестіе). Друковано у Мамонічэй. Вильно 1574—1575.

**Псалтыръ.** Вильно у мамоничей 1575—1576.

**Апостолъ.** Вильно 1576.

Первая часть нового завета або тестаменту подлугъ словенского разделенья то есть отъ чотырехъ евангелістовъ святое евангеліе ісуса христа спісаное въ котерыхъ іжъ одно пісмо евангельское прото одным словомъ его назвали евангеліе. (У друкарні Васіля Тяпінскаго каля 1580 года).

Книга новаго завѣта, внеиже на преди псалмы блаженнаго давида пророка и царя. Накладом князя Константина Острожскаго. Острог на Волыні 1580.

Библія спрѣчь книгы ветхаго и новаго завѣта, по языку словенску отъ еврейска въ еллиньскіи языкъ седми десят и двѣма богомудрыми преводники прежде воплощенія господа бога и спаса нашего ісуса христа тыи лѣта на желаемое повелѣніе птоломея филадельфа царя египетстк преведенаго зводу съ тщаніем и прилѣжаніемъ елико мощно помощію божіею послѣдовася и исправися в лѣто вовоплощеніи господа бога и спаса нашего ісуса христа 1581. Остог 1580—1581. Накладом князя Константіна Острожскаго.

Хронологія Андрея Рымши. Острог 1581.

Псалтырь. Вильно 1581.

Октоихъ (осмогласнік). Надрукованы Васілем Гарабурдою, Вільно 1582.

Служебникъ у Мамонічей, благословеніемъ Онисифора митрополита Кіевскаго. Вильно 1583.

Катехизмъ или наука всѣмъ православным христіяном к повченію велми полезно з латинскаго языка на рускіи язык ново преложоно. Друкованъ у Вильни року Божого нарожденія 1585 з дозволеньемъ старшихъ. (Каталицки катахизм написаны езуітамі).

Генадия патриярха константинопольскаго. по нареченію сколяриса диалог или само друга розмова. Ку тому с книги Иоанна дамаскина, прение второе христіанина з сарацыном или з магметаном. И третее слово иже во святых отца нашего иоанна Златоустаго патриярха константина града в немже о терпѣнии и благохвалении да неплачемся злѣ о умерших. У Козмы и Лукаша Мамоничей. Вильно 1585.

Грамматика. Вильно 1586.

Трибуналъ обывателемъ великого князства литовского на сойме варшавскомъ даны року 1580. В Вилни в друкарни Мамоничовъ року 1586.

Псалтыр с Возслѣдованіемъ. У Мамонічей Вильно 1586.

Календар Римски новы Герасима Смотрицкаго. Острогъ 1587.

Статут велікого князтва літовского от наяснешого государя короля его милости жикгимонта трете-

го на коронацыи въ краковѣ выданы. Друковано вволь-номъ месте виленьскомъ, въ друкарни дому мамоничовъ. 1588.

Исповѣданіе о исхожденіи святого духа Острогъ 1588 г.

Маргаритъ Іоанна Злотоустаго. Вильно 1588.

Чинъ Виленскаго Братства. Вильно 1588.

Грамота короля жикгимонта III. Вильно 1589.

Апостолъ у Мамоничовъ Вильно 1591.

Псалтырь. Вильно у Мамоничовъ 1592.

Псалмы давида пророка и царя. Извѣстуется путь къ благословенію вѣчному. Всяка радость яже неимат от добродѣтеле віну таковая абіе подвизаніе желаніе въ обретшимъ ту воздвизаетъ. Блаженно бо воистіну тож и добро. Кнемуж вся взіраютъ, егож вся желаютъ. В Вилни. Здрукарни Мамоничовъ року 1593.

Евангеліе толковое. Различными святыя каѳолическія сирѣч соборныя церкве христовы учителми. В вся до году седмицы, такожде же нагосподскія празники. В друкарни з дому мамоничовъ. Вильно 1595.

Катихизисъ С. Сизанія. (Вильно?) 1595.

Унія албо выкладъ преднейшихъ артыкуловъ ку зъодноченью грековъ с костеломъ рымскимъ належащыхъ. У. Вилни 1595. (Выданьне езуіцкое, аутар здаецца Іп. Поцей).

Псаломница (Псалтырь). Вильно 1595.

Молитвы повседневные з многих святых отцовъ церкве христовы учителей, с писма греческаго въ кратцѣ избраны И ины молитвы на всю седмицу святого кирилла инока. Выдрукованы сутъ въ Вилни. В друкарни братства церковного у привилеваной 1596.

Казанье святого Кирилла патріарха іерусалимскаго о антіхристѣ и знаках его з розширеніемъ науки проті ересей розны. Kazanie s. Cyrylla Patryarchy Jerozolimskiego o Antychryscie, y znakoch iego z rozszyrzeniem nauki przeciw herezyom roznym. W Wilnie, roku od stworzenia swiata 7104, а от воплощенія господа нашего ісуса христа 1596.

Псаломница (Псалтырь). Вильно 1596.

Часовникъ. Вильно 1596.

Лист Іеремеи Патріархи Константинопольскаго напоминалныи... о втором пришесвіи христовѣ и о Антихристѣ. Вильно 1596.

Грамматіка словенска совершеннаго искуства осми частій слова и иных нуждных. Ново составлена Л. Z. В Вилни 1596.

Наука ку чытаню и розуменю писма словенского: ту тыж о святой тройцы и вочловеченіи господни. В Вилни. В друкарни Братства. Року Божого 1596.

Книга о новом календарѣ. Римъ въ друкарне апостольской року Божого 1596.

**Описанье и оборона собору руского Берестейского В року 1596 месяца октебра пристойне од старшихъ згромажоного. У Вильни року Божого нароженья 1597.**

**Апокрисисъ албо отповѣдь на книжкы о соборѣ берестейскомъ именем людей старожитнои релѣй (набоженства) греческои черезъ Христофора Филялета (носца истинолюбца) врихлѣ дана. З Вильня остатнего дня месяца октобра по старожитному року 1597.**

**Ектезисъ албо короткое собраніе справъ, которыя ся дялы на памятномъ Сыноди Брестенскомъ.** (Вильно?)

**Пересторога.** (Вильно?).

Казаніе П. Могилы. Острогъ.

## Беларускіе кнігі XVII сталецьця.

**Евангеліе** у Мамоничей. Вильно 1600.

**О вѣрѣ** Л. Зизанія. Острогъ 1602.

Оборона собора флорентинскаго противъ фальшывому недавно отъ противниковъ згоды выданому, освѣцоному ксижати Яснѣ вѣльможному своему милостивому пану Янушови воеводѣ волынскому въ ласце божей душеспасительнаго здравья и фортуннаго въ долгій вѣкъ панованнія вѣрне жычитъ N. A. M. K. Вильно 1605.

Лѣкарство на оспалый умыслъ чоловѣчій а особливе на затвердѣлые сердца людскіе заведеные свѣтомъ, альбо якими грѣхами... Даміан недостойный презвитеръ. Осгрогъ 1607.

Гармонія альбо согласіе вѣры сакраментовъ и церемоней святое восточное церкви съ костеломъ рымскимъ. (Вильно 1608 ?)

ΘΕΣΕΣ сиречь извѣстны предложенія отъ учеій еже о тайнах церковныхъ. (Вильно 1608?).

Книга нового завѣта. Въ нейже напреди псалтырь блаженнаго пророка и царя давида. Выдана коштомъ и накладомъ вельможнаго пана богдана князя огинскаго подкомораго троцкаго працею и пильнымъ стараньемъ иноковъ церкви братское С. Духа. В Евю 1611.

Евангеліе альбо казанья на каждую недѣлю и свята урочысты. В Евю 1616.

Евангеліе учительное альбо казанья на недѣли презъ рокъ цалы и на праздники господске. Въ Романовѣ Волынскемъ 1619.

Казаніе на честны погребъ Леонтья Карповича Епископа Мелетія Смотрицкаго. Вильно 1620.

Ляментъ свѣта убогихъ Мелетія Смотрицкаго. Вильно 1620.

Палинодія чили отреченіе Захаріи Копыстенскаго В Киевѣ 1620.

Псалтырь блаженнаго пророка и царя Давида Вильно 1623.

Омилія альбо казаніе на погрѣбѣ отца Елисея Плетеницкаго року отъ созданія міра 7133 Захаріи Копыстенскаго (Кіевъ?) 1625.

Бѣседы духовныя преподобнаго Макарія Египетскаго многими пожитками душезбавенными наполняныя о нужномъ христянамъ доскональствѣ. Вильно 1627.

увѣщеваніе виленской братіи Мелетія Смотрицкаго. Краковъ 1629.

Антідот Андрея Мужиловскаго. (Вильно?) 1629.

Вирши съ григорія богослова въ святы вѣлики пятокъ. Львовъ 1630.

Гисторія албо правдивое выписаніе святого Іоанна Дамаскина о житіи святыхъ преподобныхъ отцовъ Валаама и Осафа и о наверненю Індіанъ. Старанемъ и коштомъ іноковъ общежителного монастыра Кутенеского. 1637.

Діоптра альбо зерцало и выраженіе жывота людского на сємъ свѣтѣ Ігумена Витолія. Вильно 1642.

Коротки зборъ благочестной вѣры. В Печерской Лаврѣ 1645—1646.

Зобраніе короткой науки о артыкулахъ вѣры православно-католицкой христианской як церковъ всходняя, апостольская учитъ. Львовъ 1646.

О дворѣ Турскаго султана. 1649.

Ключъ разуменія Іоанникія Галятовскаго. Киевъ 1659.

Конфедерація войска великаго княжества литовскаго. (Вильно?) 1662.

Небо новое съ новыми звѣздами Іоаанікія Галятовскаго. Киевъ 1665.

Казанія или поученія прыданыя до книги „Ключъ разуменія“. Кіевъ 1666.

Небо новое съ новыми звѣздами Галятовскаго. Черниговъ 1677.

Повѣсти смѣхотворны: 1679.

Кроника о земли польской (1681).

Краткія и вензловатые повѣсти Б. М. др. і г.

Путешествіе у землю святую Радзивилла Б. М. др. і г.

Книга совѣтъ воинскій з Б. Папроцкаго Б. М. др. і г.

Зерцало человека христіанскаго. Б. М. др. і г.

О лѣкарствахъ Сиренюша. Б. М. др. і г.

Гисторія Гвагнина. Б. М. др. і г.

Кроника литовская Стрыйковскаго. Б. М. др. і г.

Проблемата философа Аристотеля Б. М. др. і г.

Літос или Камень съ пращи истины церкви Б. М. др. і г.

Мечъ духовны на помощъ церкви воюющей Лазара Барановича. Киевъ 1686.

Боговѣ поганьсци Галятовскаго. Черниговъ 1686.

Души людей умерлыхъ зъ тѣла выходячи одходятъ на тры мѣста: инши до неба, инши до пекла, инъшы на мытарства. Праз вѣлебнаго Архімандрита Галятовскаго. Черниговъ Сѣверски 1687.

О сакраментахъ. Леона Кишкн. Полоцкъ 1697.

Небо новое съ новыми звѣздами Галятовскаго. Могилевъ 1699.

## Беларускіе кнігі XVIII сталецьця.

Собраніе припадковъ духовнымъ особомъ потребное имущее въ себѣ науку о Сакраментахъ, о десяти Божихъ приказаньяхъ. Супрасьль 1722.

Zbior praw i przywileiów Wilnu służących zebrał Piotr Dubieński, burmistrz Wileński. Wilno 1788. (Много документоў надрукованых па беларуску).

Бѣсѣды парохіальныя. Почаевъ 1789.

**Прологъ**. Супрасль 1791.

Пѣсни Давида пророка и царя. Почаевъ 1798.

Казання коштомъ Фрацишка Владислава Чарнецкаго. Луцкъ 1798.

(С прычыны недахвату мейсца ў гэтым гаду ў Календары друкуецца толькі бібліографія до XIX-го сталецьця).

**Ромуальд Земкевіч.**

# ЖАРТЫ.

### Разумны хлопец.

— Чаго плачэш, Янук?
— Капейку згубіў.
— Вось табе дзьве, толькі не плач.
Янук узяў дзьве капейкі, схаваў ды ізноў плачэ.
— Да чагож ты плачэш?
— Як жэ мне не плакаць? Як бы не згубіў гэнай капейкі, дык меў бы ўжо тры.

### Бедная баба.

— А чаго вы, бабка, плачэце?
— Як жэ мне, галубок, не плакаць, калі чыталі ў цэркві, што на тым сьвеце будзе „плач і скрыгот зубамі“. А чым жэ я буду скрыгатаць, калі ў мяне ані аднюсенькаго зуба нема?

### Д з я к.

— Дзячэ, дзячэ! чаго твая семья плачэ?
— Ня ўсім жэ пеяць.

### К а ў б а с а.

Казаў мне адзін дзядзька: што, якбы каўбаса мела скрыдлы, тады б пекнейшай птушкі не было-б на сьвеце.

### Добры сын.

— Эй, сынок, не рабі так, а то будзем біцца!
— Тпру...
— А што?
— Што ж, калі біцца, так біцца.

### Як лепей.

Спаткалі чэлавека разбойнікі. Адзін кажэ: „Зарэжэм!“ Другі кажэ: „Павесім“. А гэты чэлавек: „Рабіце — кажэ — людзі добрые, як лепей!“

## Абы скарэй.

Сабраўся ехаць на кірмаш чэлавек з жонкай. Селі абедаць. Жонка кажэ: „Еш, чэлавечэ, юшку, а я курацінку, каб скарэй“. „Добра“. — Паабедалі. Выйшлі на двор, чэлавек і кажэ: „Сядай, жонка, на воз“.—„Ды ешчэ не запрэжэно?“—„Не трацъ часу, абы скарэй!“—сеў на каня дый паехаў на кірмаш.

## Дзіцятко с плачэм.

Аднаго разу сядзелі купцы на заежджым дварэ; гаспадыня выйшла с хаты, а хлопчык яе пачаў крычаць за маткай. Крычаў, пакуль не змарыўся, а тады замоўк.

— Ну, дзякуй Богу, перэстаў—кажэ адзін купец.

А хлопчык, пачуўшы гэта адказывае:

— Ага, перэстаў. Адпачыну ды ізноў буду.

## Добрая кухарка.

Казала нявестка: „чорт яе, мама, ведае, гэтую свякроўку! Яна варыць боршч у такім сагане, як вядро, ды усё зьядуць і ешчэ ім мало. А я звару у маленькім, а ўсё-ж больш палавіны астаецца“.

## Дзед ды баба.

Недзе, кажуць, дзед ды баба пасварыліся памеж сабой дый пастанавілі адно да другого не гаварыць. Але ня доўга вытрымалі, бо ў бабы цярпеньня не хваціло, дык яна і пытаецца: „Стары, ці ты ўчора чхнуў?“ „А што?“—панура адказывае ён. „Будзь здароў!“ ласкава кажэ яна.—„Дзякую“. Гэтак і пагадзіліся.

## Бацька цыгана

— Цыгане, твайго бацьку злавілі!

— Дзе?

— У каморы.

— Вось дзіва! Ў каморы кожнаго зловіш! А вы яго ў поле пусьціце, ды тагды лавіце!

## Мачыха.

Абдзеліла мачыха двох сваіх пасынкоў кожнаго цэлым яблыкам, а свайму сыну нічога не дала, ды кажэ да пасынкоў: „А вы-ж і майму сыну дайце хоць па палавінцэ“.

## Брэхуны.

Адзін хлопчык казаў: Як я быў хворы, дык да мяне прыйшло шэсць знахароў і дзьве чараўніцы“. А другі на тое і адказаў; „А як я быў хворы, дык цэлы тыдзень перэд хатай стаяў воз з дамавінай“.

### Чаму людзі з рознымі валасамі родзяцца?

— Чаго гэта людзі родзяцца то чорные, то белые?
— Бо адны родзяцца ў дзень, а другіе ў ночы.
— А рудые калі родзяцца?
— Так сама ў дзень, толькі тады, як сонцэ дужэ паліць.

### Неудзячны.

— Спекла я сягоньня, мамуню, пірог свайму чэлавеку, ды такі румяны, як яблычко. А ён як ударыць мяне пірагом у плечы, усё роўна як камянем. Аж цяпер баліць.

### Абраз і табака.

— Быў на кірмашы, куме?
— Быў. Абраза купіў.
— Ану, пакажы.
— А бадай жэ цябе, куме... Не магу развязаць— рукі памёрзлі.
— Дык цягні, куме, с капшука табаку—закурым.
— Давай барджэй.

### Асьцярожные.

Ішлі раз лесам глухі, сьляпы, крывы дый голы. Аж глухі кажэ: „Слухайце, нешта трэснуло". А сьляпы: „глядзіце, гэта разбойнікі".—„Скарэй на ўцекі" кажэ крывы. А голы: „Бо нас абдзяруць",

### Носы абцірае.

— Мая жонка, як прыйдзе ў цэркву, дык усім носы паабцірае.
— Чаму?
— Бо як засмаркаецца, дык кожны, хто яе ўгледзіць, нос сабе вытрэ.

### За што?

Вучыцель пытаецца вучня ў школе:
— За што Бог выгнаў Адама і Еву з раю?
За тое, што яны зьелі зялёнае яблычка, а зялёнаго ня можна есьці, бо жывот забаліць.

### Цыганскі выкрут.

У аднаго гаспадара загарэлася хата. Людзі зьбегліся ратаваць, а цыган стаў дый крычыць на ўсё горла:
— Гасіце, людзі, гасіце.

— А ты-ж чаму не памагаеш?—пытаюцца яго.
— Э, ешчэ скажуць, што я украў нешта.

## Ня людзі.

Спатканіся раз беларусы з мазурамі. Вось мазуры і пытаюцца:

— „Хто вы такіе?“—„Мы мужыкі“—адказуюць беларусы. — „Ага музыцы. А адкуль ідзеце?“ — „Ад Буга“—„Ага, ад Бога. А што-ж вы нясеце на кіях?“—„Пасталы“.—„Ага, апосталы“. „Бачыце зьвернуўся на рэшце адзін з мазуроў да сваіх, я добра казаў, што гэта ня людзі. Гэта апосталы і музыканты ад Бога“.

## Што тыдзень.

Пытаўся баларус маскаля:
— Калі у вас Вялікдзень?
— У Пятроўку,—кажэ, маскаль.
— Не, ня тое. Калі у вас Васкрасеньня?
— Эвва! У нас што тыдзень воскрасеньне бывае.

## Дурны сын.

Прасіла ўдава свайго дурнога сына:

— Ідзі, сынку, да пана дый скажы: „Прасіла мама яснавельможнаго пана, каб вы нам далі жэрдак сьвінцэ хлеў адгарадзіць“.

А сын прыйшоў да пана дый кажэ: „прасіла мама пана, каб вы нам далі вяльможных яснай сьвінцэ хлеў адгарадзіць!“

## Канец.

Выбачайце, добрые людзі, ўжо мне брэхаць будзе—трэба на другі сьвет ехаць, ды там рукамі махаць. А там людзі не гуляюць, соль на жыта меняюць.

Вось вам і ўся казка, а мне абаранкоў вязка.

Сабраў і падаў **Ромуальд Земкевіч.**



Адрывак Літоўскаго Статута 1588 г.
(по экзэмпляру Віленск. Публ. бібліотэкі).

# Беларуская Выдауніцкая Суполка

*„Загляне сонцэ і у нашэ ваконцэ“*

**Пецербург 6 лінія д. № 1, кв. 20.**

Прыймае да друку беларускіе рукопісы. Сабірае для выданьня беларускіе музыкальные творы і народные песьні з нотамі. Прадае свае і чужые беларускіе выданьня—рускімі і лацінскімі літэрамі, а такжэ высылае сваім чытачам кнігі ў розных другіх мовах па чужым каталогам. Заказы споўняе добра і скора. Кнігарням са сваіх выданьнёў робіць вялікшую скідку. Каталог беларускіх кніг і копію умовы высылае безплатна. Запісаўшымся ў Суполку паводлуг умовы, а такжэ унёсшым наўперод ня менш за 3 руб, грошэй, Суполка высылае усе новасьці беларускай літэратуры кожны раз па выхадзе іх у сьвет, пакуль хватае прысланых грошэй. Хто выпісывае кніг выданьня Суполкі за адзін раз больш як за поўрубель гатовымі грашмі, - не плаціць за перэсылку кніг.

## Суполка выдала і узяла на склад.

Беларускі лемэнтар 6 к. з рыс.
Першае чытаньне 6 кап. з рыс.
Другое чытаньне 25 кап.
Гутаркі аб небе і зям. 15 кап. з рыс.
Жалейка Я. Купалы 50 кап. лепш. выданьне 80 к.
Цукер В. Тройцы 3 кап.
Гутаркі аб гаспадарцы 3 к.
Як ратаваць уздутую жывёлу 3 кап. з рыс.
Дым Конопніцкай 4 кап.
Вязанка Я. Лучыны 4 кап.
Казкі А. К. 6 кап.
Казка аб вадзе 3 кап.
Тарас на Парнасе 5 к.
Гедалі Э. Ожэшковай 6 к. з рыс.
Зямельная справа ў Новай Зеляндіі 3 кап.
Як бараніцца ад халеры А. Гр. 1 кап.

Biełaruski lementar 6 k. z rys.
Pieršaje čytańnie 6 k. z rys.
Dudka biełaruskaja M. Buračka (niema ŭ S-ce).
Smyk biełaruski M. Buračka (niema ŭ S-ce).
Pan Tadeuš Marcinkiewiča 25 k. lepš. wydańnie 50 k.
Hapon Marcinkiewiča 15 k. lp. 30
100 prykazaŭ, zabadak ect. 13 k.
Cukier W. Trojcy 3 k.
Hutarki ab haspadarcy 3 k.
Jak ratawać uzdutuju žywiołu 3 k. z rys.
Gedali E. Oržeškowaj 6 k. z rys.
Ziamielnaja sprawa ŭ nowaj Zelandii 3 k.
Kazka ab wadzie 3 k.
Taras na Parnasie 5 k.
Jak baranicca ad chalery A. Hr. 1 k.
Karotki katechizm 5 k.

Dumki białoruskie — spisane przez W. Weryhę Kraków 1889 40 k. Podania białoruskie, zebrane przez W. Weryhę Lwów 1889 г. 80 kap.

Апрыч гэтаго ўсяго можна выпісываць с Суполкі: Бѣлорусcы А. Новины 10 к. Словарь бѣлорусскаго нарѣчія Носовича 3 р.; Программа для собиранія особенностей бѣлорусской рѣчи Карскаго 25 кап.; Государственное Хозяйство В. Княжества Литовскаго. Довн. Запольскаго 4 руб.; Очерки по организаціи западно-русскаго крестьянства въ XVI в. Дов.-Запольскаго 3 р. 50 к.; Западно русскіе переводы псалтыря въ XV—XVIII в.в. изслѣдованія Карскаго 3 р. документы Московскаго Архива, М-ва Юстиціи (найбольш беларускіе) 3 р.; Страница изъ исторіи крѣпостного права въ XVIII—XIX в.в. Довн.-Запольскаго 20 к.; матеріалы для изученія языка и быта русск. населенія Сѣверо-Зап. края, собраные П. Шейном т. I бытовая и семейная жизнь бѣлорусса въ обрядахъ и песняхъ ч. 1-я 3 р., ч. 2 я 2 р.; т. II сказки, анекдоты, легенды, пословицы, проклятія, заговоры и проч. 3 р. ; т. III описаніе жилища, одежды, игръ, колдовства, знахарства и тому под. 3 р.; Верхнее Поднѣпровье и Бѣлоруссія съ 11 политипаж., 37 діагр., съ 11 картами, составили П. Семеновъ, Довн.-Запольскій и др. (IX томъ геогр. описанія Россіи)— 3 р. 75 к., въ переплетѣ 4 р. и 4 р. 75 к.

Пачтовые беларускіе пісулькі розных гатункоў па 5 к. і друг.

Выданьня Суполкі назначэны—о, перэклады—кропкай.

Зданы ў друк: VI і VII томы беларускіх песьняроў і першы спытак беларускіх песьняў з нотамі.


**У складзе машын і прылад земляробных.**

# ЗЫГМУНТА НАГРОДЗКАГО

*Завальная № 11 у Вільні*

Кожны землероб знойдзе у гэтым складзе ў вялікім выбарэ:

**Плугі** адно і двуконные прыдатные на грунты легкіе, сярэдние і цяжкіе.

Наймацнейшые спружыновые бароны з самай лепшай амэрыканскай сталі.

**Малатарні** ручные і конные, штыфтовые і цэповые, каторые памімо таго, што вельмі лёгка працуюць, ёсць вельмі трывалые і да чыста вымалачываюць збожа, чым часу і працы шмат ашчаджаюць.

**Манэжы** вельмі практычна збудованые, рознай велічыны і клейноў.

**Веялкі** (арфы) розных сыстэмоў і млынкі да ачышчаньня збожжа.

**Сечкарні** ручные, ножные і конные на 2 да 5 гатункоў сечкі.

Менёные машыны і прылады ёсць краёвага вырабу і заграні̇чных гандляроў.

Вядомые з сваей дабраты, а вельмі зручные пры працы сярпы літоўскіе, косы стырыйскіе і іншые рэчы. Заўсёды ў вялікім выборэ, у складзе машын і прылад землеробных.

**Зыгмунта Нагродзкаго ў Вільні.**

## Тэхнічнае бюро устройства паркоу і фруктовых садоу

# Язэпа Павловіча

*Юркоускі праспэкт 9. (дом Снядэцкай).*

Продаж насён, дрэвак, кветных і фруктовых кустоў, продаж агародніцкіх і пчэльнікоўскіх прылад.

Агародніцкая школа прыймае вучнёў ад 1 студня 1910 г.



**У лепшых кнігарнях можна купіць ешчэ кнігі прафэсара Е. Ѳ. Карскаго.**

Обзоръ звуковъ и формъ бѣлорусской рѣчи. Москва. 1886. Ц. 1 р. 25 к.

Западно-русскіе переводы псалтыри въ XV—XVII вѣкахъ. Варшава . 1896. Цѣна 3 руб.

Западно-русскій сборникъ XV в., принадлежащій Императорской публичн. бібл., Q. I № 391. СПБ. 1897. Ц. 40 к.

Бѣлоруссы. Т. I. Введеніе въ изученіе языка и народной словесности. Варшава. 1903. Ц. 2 р. 50 коп. (тоже: „Виленскій Временникъ“, вып. I. Вильна. 1904 г.) Т. II. Языкъ бѣлорусскаго племени. Вып. 1. Историческій очеркъ звуковъ бѣлорусскаго нарѣчія. Варшава 1908. Ц. 3. р.

Бѣлорусская Энеида на изнанку. Съ приложеніемъ текста сохранившихся отривковъ. Харьковъ. 1908. Ц. 30к.



# СКЛАД НАСЕНЬНЯ

**Императорскаго Расейскаго Агародніцкаго Таварыства.**

**Віленскі аддзел:** *Вільня, Вялікая вуліца № 4.*

Мае на продаж насеньня гароднін, кветак, кормных траў, розные парашкі для гароднін, а вясной расаду, флянцы кветак, прышчэпы і др.

Хаўрусным крамам, гаспадарскім таварыствам і суполкам даецца уступка з цэн.

Рекламируйте
Ваши предпріятія
въ
Ботаническомъ
Саду.
Онъ и лѣтомъ, и зимой посѣщается массой избранной публики.

Рекламируйте
Ваши предпріятія
въ
ПОЧТОВО-ТЕЛЕГРАФНЫХЪ
УЧРЕЖДЕНІЯХЪ
Виленской, Ковенской и Сувалкской губ.
100,000
человѣкъ разн. состояній ежедневно видятъ Вашу Рекламу.

Обращайтесь исключительно
Т-во
„РЕКЛАМА“
Контора: Вильна, Георгіев. пр. 4, кв. 10.
къ Т-ву „Реклама“.
Тел. 830.

Рекламируйте
Ваши предпріятія
на программахъ спектаклей русской труппы въ городскомъ театрѣ и военномъ манежѣ.
ВАША РЕКЛАМА
въ теченіи зимняго сезона (около 6-ти мѣсяцевъ) ежедневно разойдется въ сотняхъ экземпляровъ.

Рекламируйте
Ваши предпріятія
въ „Справочной книгѣ о телефон. сообщеніяхъ гор. Вильны“.
ОНА
круглый годъ служитъ настольной справочной книгой болѣе чѣмъ для 1000 абонентовъ и кромѣ того расходится въ огромномъ количествѣ экземпляровъ какъ „Спутникъ-Справочникъ по городу Вильнѣ“.

B000000214837